Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

ГОД ВЫДАННЯ XXIV

№ 85 (6967)

ЧАЦВЕР 10 КРАСАВІКА 1941 г.

ЦАНА 15 КАП.

Всесоюзная БИБЛИОТЕКА им. Ленина

Сёння ў нумары:

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР **Аб назначэнні тав. Гайсіна В. Б. намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў БССР.**

Пленум Вілейскага гаркома КП(б)Б.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ: **З. Ларысаў** — На справаздачна-выбарным сходзе соўгаснай партыйнай арганізацыі. **Р. Сыркін** — Размовы замест практычнай работы. **Ф. Маргаўцова** — Партыйны кантроль пановаму.

АРТЫКУЛЫ: **Тар. Хадкевіч** — У новых калгасах. **Е. Аляксееў** — За высокі ўраджай канюшыны. **Г. Львова** — Вялікія магчымасці і малая ініцыятыва. **Л. Зайцаў** — Разгортваем масавыя меліяратыўныя работы. **Ф. Руцкі** — Вясна не будзе чакаць.

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ. **С. Науменка, В. Макееў** — У палявой ахове. **І. Чэпік** — Ефрэйтар Сяргей Гаўрылаў.

Бібліяграфія. Больш каучука роднай краіне!

ЗА РУБЯЖОМ: Вайна ў Еўропе і Афрыцы. (Дзённік ваенных дзеянняў). К прыбыццю англійскіх войск у Грэцыю. Германскія паведамленні аб ходзе ваенных дзеянняў на Балканах. Зводка вярхоўнага камандавання грэчаскай арміі. Заява Рузвельта. Вайна на Балканах і ў Афрыцы. (Агляд ваенных дзеянняў з 1 па 8 красавіка).

Водгукі замежнага друку на заключэнне дагавора аб дружбе і ненападзе паміж СССР і Югаславіяй.

ЭКАНАМІЧНАЯ АСВЕТА ПАРТЫЙНАГА І ГАСПАДАРЧАГА АКТЫВА

Павышэнне эканамічнай пісьменнасці нашых кадраў, і ў першую чаргу партыйнага і гаспадарчага актыва, з'яўляецца неадкладнай задачай дня. Гэта задача вынікае з рашэнняў XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі, якая патрэбавала ад партыйных і гаспадарчых работнікаў больш глыбока ўваходзіць у эканоміку прадпрыемстваў.

Перад нашай краінай стаіць гіганцкая задача — у максімальна кароткі гістарычны адрэзак часу не толькі дагнаць, але і перагнаць таксама ў эканамічных адносінах галоўныя капіталістычныя краіны. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна совецкі народ з поспехам вырашае гэту вялікую гістарычную задачу. Дзяржплан СССР, па прапанове ЦК ВКП(б) і Совецкага ўрада, працуе зараз над генеральным планам развіцця народнай гаспадаркі Саюза на 15 год, у якім прадугледжваецца вырашэнне асноўнай эканамічнай задачы.

На XVIII з'ездзе ВКП(б) і на XVIII партыйнай канферэнцыі партыя ва ўсю пырыню паставіла пытанне аб мабілізацыі ўсіх рэзерваў, паскараючых рух уперад усёй нашай народнай гаспадаркі. Асноўная дырэктыва партыйнай канферэнцыі — канэшным чынам палепшыць работу прамысловасці і транспарта — патрабуе ад усіх партыйных і гаспадарчых кіраўнікоў асаблівай увагі да тэхнікі, эканомікі і фінансаў. Гэтыя патрабаванні ныкгуюцца і інтарэсамі ўсямернага ўмацавання абаронай магутнасці краіны, што асабліва важна ў сучасным складаным міжнароднай абстаноўцы.

Што значыць максімальна мабілізаваць вытворчыя рэзервы? Гэта значыць, што ў практычнай дзейнасці неабходна спалучаць барацьбу за асваенне новай тэхнікі з больш эфектыўным скарыстаннем усяго абсталявання і безумоўным выкананнем **усіх эканамічных** паказальнікаў планаў.

Мала выконваць план па колькасці: трэба каб кожнае прадпрыемства было рэнтабельным, прыбытковым. А для гэтага ёсць толькі адзін шлях — безумоўна выконваць планы зніжэння сабекошту. Глыбока ўваходзіць у эканоміку азначае аналізіраваць сабекошт, які з'яўляецца асноўным паказальнікам, характарызуючым якасць работы прадпрыемства, ведаць становішча з загрузкай абсталявання, ці ўкладваецца прадпрыемства ў матывы па сыравіне, паліву, электраэнергіі, глыбока ўскрыць крыніцы страт і на справе павесці барацьбу з імі, дабіваецца сапраўднай мабілізацыі ўсіх рэзерваў і рэсурсаў прадпрыемства.

Справіцца з гэтымі задачамі зможа толькі той кіраўнік, які ўладае ведамі ў галіне тэхнікі, эканомікі, фінансаў. Таварыш Сталін указвае: «Пішыце колькі хочаце рэзалюцый, кляніцеся якімі хочаце словамі, але калі не ўладаеце тэхнікай, эканомікай, фінансамі завода, фабрыкі, шахты — толку не будзе»...

На XVIII з'ездзе ВКП(б) тав. Молатаў, паставіўшы пытанне аб мабілізацыі нашых рэзерваў і скарыстанні ўсіх магчымасцей для росту гаспадаркі і падняцця прадукцыйнасці працы, гаварыў: «Трэба на справе забяспечыць увагу да эканомікі, да кошту вырабляемых прадуктаў. Трэба добра ведаць, ва што абходзіцца дзяржаве работа кожнага прадпрыемства, кожнай арганізацыі».

Патрабуючы ад кожнага гаспадарчага кіраўніка, каб ён заглядваў у баланс, вывучаў справаздачнасць, клапаціўся аб гаспадарчым разліку, таварыш Молатаў гаварыў, што трэба рашуча пакончыць з эканамічнай няграматнасцю, як з антыдзяржаўнай, антыбольшэвіцкай практыкай.

За апошні час, асабліва пасля партыйнай канферэнцыі, цяга нашых кадраў да вывучэння марксісцка-ленінскай эканамічнай навукі значна павысілася. Партыйныя органы правялі пэўную работу па арганізацыі школ і семінараў, дзе ўсебакова вывучаюцца пытанні эканомікі ў канкрэтным прыкладзе да вытворчасці.

Значнага размаху дасягнула справа эканамічнай асветы актыва ў горадзе Мінску. Тут па ініцыятыве гаркома КП(б)Б і горвайкомаў арганізаваны рад семінараў для дырэктараў, начальнікаў цэхаў, майстроў прадпрыемстваў, кіраўнікоў арцелей, работнікаў гаспадарчых устаноў і наркаматаў. Семінары арганізаваны таксама на буйнейшых прадпрыемствах горада. У Сталінскім раёне ў семінарах па эканамічнай асвеце займаюцца 250 чал. Чытаюцца таксама эпізадычныя лекцыі на тэмы: «Асноўныя пытанні планіравання вытворчасці», «Тэхналогія і нарміраванне», «Праца і зарплата», «Арганізацыя вытворчасці», «Аналіз баланса» і г. д.

Аналагічная работа праведзена ў Віцебску, Гомелі, Беластоку, Магілеве. У Магілеве ў семінары, арганізаваным гаркомам партыі, займаюцца каля 60 партыйных і гаспадарчых работнікаў. Арганізаваны таксама курсы па эканамічнай асвеце на буйнейшых прадпрыемствах горада.

Усё гэта паказвае, што ў партыйных і гаспадарчых кіраўнікоў паявіўся густ да эканамічнай асветы. Нельга, аднак, прызнаць дастатковым ні размах, ні, у асаблівасці, якасць вучобы.

Ва ўсёй рабоце па павышэнню эканамічных ведаў трэба менш на ўвазе, па крайняй меры, дзве бліжэйшыя практычныя задачы: навучыць гаспадарчых і партыйных кіраўнікоў эканамічнай граматне, дапамагчы ім атрымаць веды ў галіне навуковай арганізацыі працы і кіравання.

Каб дасягнуць гэтых задач, неабходна глыбокая сувязь тэорыі з практыкай. Правільна робяць тыя лектары, якія свае тэарэтычныя выкладкі будуюць на аснове скарыстання канкрэтнага матэрыяла — балансаў, гадавых і квартальных справаздач прадпрыемстваў. Гэта прыдае эканамічнай асвеце канкрэтную накіраванасць, мэтаімкнённасць, дзейснасць, што неабходна на даным этапе ў асаблівасці.

Трэба ўсё-ж сказаць, што агульным недахопам семінараў і курсаў па эканамічнай асвеце з'яўляецца тое, што ўся работа ў іх абмяжоўваецца лекцыямі. У вельмі рэдкіх выпадках прымяняецца самастойная работа. Між тым, без яе цяжка навучыцца эканамічна граматна лічыць і аналізіраваць баланс, справаздачнасць і т. д.

Далей, кідаецца ў вочы выключная раскіданасць тэматыкі лекцый, адсутнасць сістэмы, распрацаванай методыкі. Несумненна, ужо назрэла неабходнасць прывесці ў нейкі парадак праграмы семінараў і курсаў, прыдаць ім пэўную сістэму. Неабходна таксама практычна паставіць і вырашыць ва ўмовах нашай рэспублікі пытанне аб шырокай завочнай эканамічнай асвеце.

Перад намі стаіць таксама і больш шырокая задача — арганізаваць вывучэнне нашымі кадрамі палітычнай эканоміі сацыялізма. Побач з вывучэннем гісторыі і тэорыі большэвізма, асваенне асноў марксісцка-ленінскай палітычнай эканоміі будзе мець велізарнае значэнне для эканамічнай вывучкі і ідэалагічнай загартоўкі партыйных і гаспадарчых кадраў.

Было-б вялікай памылкай меркаваць, што ўсе партыйныя і гаспадарчыя работнікі — вялікія і малыя — зразумелі неабходнасць сур'ёзна ўзяцца за павышэнне сваёй эканамічнай граматнасці. На жаль, мы нярэдка сустракаемся з балбатунамі, невукамі і «ўсезнайкамі», аб якіх тав. Маленкоў гаварыў на XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі. Аб адным такім партыйным кіраўніку — сакратару партыйнага бюро Магілеўскага клеевага завода т. Гурэвічу нядаўна пісалася ў нашай газеце. Ён лічыць, што баланс завода — справа планавікоў і бухгалтароў. Гурэвіч нават не хоча зрабіць спробы пранікнуць у «тайны» баланса. Вядома, што гэта прывяло да вельмі дрэнных вынікаў.

Пара зразумець, што партыйныя і гаспадарчыя кіраўнікі, якія пагарджаюць пытаннямі эканамічнай асветы, ніколі не змогуць стаць сапраўднымі большэвіцкімі гаспадарамі на фабрыках і заводах, у трэстах і наркаматах.

Партыйныя арганізацыі павінны ўзяць пад свой непасрэдны кантроль усю справу эканамічнай асветы партыйнага і гаспадарчага актыва, памятаючы, што яна мае выключнае значэнне для далейшага паступальнага руху ўперад народнай гаспадаркі краіны сацыялізма.

ПЛЕНУМ ВІЛЕЙСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б

ВІЛЕЙКА. (Кар. «Звязды»). Адбыўся пленум Вілейскага гаркома КП(б)Б. Пленум абмеркаваў вынікі сакавіцкага пленума ЦК КП(б)Б і становішча партыйнай прапаганды і агітацыі ў горадзе. З дакладам па першаму пытанню выступіў сакратар гаркома КП(б)Б тав. Лібман.

Вялікую частку свайго даклада тав. Лібман прысвяціў характарыстыцы ходу будаўнічых работ у горадзе і задачам партыйнай арганізацыі ў гэтай галіне. У мінулым годзе план будаўнічых работ быў выкананы толькі на 55 проц. Гэта аб'ясняецца вялікімі непаладкамі ў рабоце будаўнічага трэста, нездавальняючым кіраўніцтвам гэтай справай з боку гаркома партыі.

У бягучым годзе трэба пабудаваць 12-кватэрны дом, гасцініцу, кінотэатр, санітарную станцыю, лазню, інтэрнат ФЗА і інш. На будаўніцтва і ўпарадкаванне горада вызначана каля 10 млн. рублёў. Аднак недахопы будаўнічай работы ў мінулым годзе не ўлічаны кіраўніцтвам облбудтрэста і многімі комуністамі-гаспадаркамі. Квартальны план будаўнічых работ выканан толькі на 70 процантаў.

Пленум ЦК КП(б)Б абавязаў партыйныя арганізацыі штодзённа займацца пытаннямі будаўніцтва. Неабходна — гаворыць тав. Лібман — упяцярыць скорасныя метады будаўніцтва, арганізаваць работы па сутачнаму графіку, давесці штодзённыя заданні да брыгад і звенняў, забяспечыць кантроль за выкананнем графіка.

Даклад па другому пытанню — аб становішчы партыйнай прапаганды і агітацыі — зрабіў сакратар гаркома тав. Станкевіч.

Па абмеркаваных пытаннях пленум прыняў адпаведныя рашэнні.

НАРАДА РАБОТНІКАЎ ЛЕСАХІМІЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ ЗАКОНЧЫЛА СВАЮ РАБОТУ

9 красавіка прадаўжаліся спрэчкі па дакладу тав. Гайсіна аб рабоце лесахімічнай прамысловасці і мерах па развіццю яе.

На ранішнім пасяджэнні выступіў упаўнаважаны Галоўлесааховы па БССР тав. Санюкевіч.

— Наша рэспубліка,—гаворыць тав. Санюкевіч,—мае вялікія лясныя масівы і безумоўна можа развіваць лесахімічную прамысловасць. Запасаў асмола ў Беларусі хопіць на 10 год. Аднак заўважаецца, што гэты каштоўнейшы від сыравіны скарыстоўваецца вельмі нерацыянальна. Прадпрыемствы многіх арцелей не даюць поўнага выхаду скіпідара. У гэтым вінавен у першую чаргу Белкаапромлессаюз, які не цікавіўся гэтай вытворчасцю. Ёсць яшчэ факты, калі смалакурныя заводы будуюцца там, дзе няма асмола. Многія прадпрыемствы размешчаны на аддегласці 50—60 кілометраў ад сыравіннай базы. Між тым доўгія перавозкі падаражаюць кошт скіпідара і смалы. Пара падумаць аб перасовачных устаноўках, наблізіць вытворчасць да месц сыравіны.

Тав. Санюкевіч далей гаворыць аб тым, што неабходна скарыстаць не толькі асмол, але і лясныя адыходы, як валежную драўніну, парубачныя астаткі і ўсякі драўнінны хлам. Трэба беражліва адносіцца да маладняка. Між тым нямала ёсць выпадкаў, калі спосабам узрываў здабываюць асмол у тых месцах, дзе вырошчваецца лясная культура. Гэта шкодна адбіваецца на лесапасаджэннях.

Выступіўшы ў спрэчках загадчык аддзела лясной прамысловасці Палескага абкома партыі тав. Мілешка гаварыў аб нарушэннях тэхналагічнага працэса вырабу скіпідара.

Невыкананне тэхналагічнай нормы выхаду скіпідара, гаворыць тав. Мілешка, з'яўляецца вынікам незахавання тэхналагічнага рэжыма. Смалакурныя катлы загружаюцца недастаткова раздробленым і ачышчаным асмолам, з вялікім процантам гнілі і пяску. Загрузка катлоў робіцца няправільна.

Старшыня арцелі «Праца» (Віцебская область) тав. Жгун падверг рэзкай крытыцы работнікаў Полацкага райвыканкома, якія не аказваюць належнай дапамогі арцелям, аддзелваюцца ўсякімі апіскамі.

За ім выступілі Карповіч—старшыня арцелі «Усход» (Віцебская область) і нам. старшыні Брэсцкага облпромлессаюза тав. Гутман і іншыя.

На пасяджэнні 9 красавіка са змястоўнай прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б) Беларусі тав. Панамарэнка. Ён падкрэсліў неабходнасць далейшага развіцця лесахімічнай прамысловасці.

Тав. Панамарэнка заклікаў удзельнікаў нарады павялічваць з дня ў дзень здабычу скіпідара і смалы—каштоўнейшых прадуктаў для многіх галін народнай гаспадаркі Совецкага Саюза.

На гэтым нарада закончыла сваю работу.

АБЛАСНАЯ НАРАДА ПЕРАДАВІКОЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

БАРАНАВІЧЫ. (Кар. «Звязды»). Днямі адбылася першая абласная нарада перадавікоў сельскай гаспадаркі з удзелам шырокага партыйнага і совецкага актыва. На нарадзе прысутнічала 600 чалавек. З дакладам аб выніках мінулага сельскагаспадарчага года і задачах калгаснікаў і ўсіх партыйных і совецкіх арганізацый у правядзенні другой большэвіцкай вясны выступіў сакратар Баранавіцкага абкома КП(б)Б тав. Бандарэнка.

Дакладчык адзначыў, што маладыя калгасы абласці за першы год свайго існавання дабіліся вялікіх поспехаў. Атрыманы нядрэнныя ўраджаі; расце пагалоўе грамадскай жывёлы. За значныя дасягненні ў галіне падняцця ўраджайнасці і развіцця жывёлагадоўлі Галоўвыстаўком зацвердзіў удзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1941 года 397 калгасаў, соўгасаў і асобных перадавікоў сельскай гаспадаркі. Экспанентамі выстаўкі залічаны ўсе калгасы Любчанскага, Мірскага і іншых раёнаў.

Па дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Выказалася 18 чалавек. Старшы агранам Мірскай МТС т. Ждановіч паведаміў, што трактары ўжо вышлі на ўчасткі і днямі пачнуць ворыва выбарачным парадкам.

Старшыні перадавых калгасаў абласці —імені Леніна, Дзятлавіцкага раёна — т. Еўшук і «Шлях сацыялізма» Гарадзішчанскага раёна — тав. Кароль падзяліліся вопытам сваёй работы.

Удзельнікі нарады абмеркавалі ўмовы соцдагавора з калгаснікамі Вілейскай вобласці. Нарада аднадушна, ад імені ўсіх калгаснікаў, прыняла абавязацельства дабіцца ў сярэднім ураджаю зернавых па 12—13 цэнтнераў з гектара, бульбы — па 200 цэнтнераў, ільновалакна — па 4 цэнтнеры, кораніплодаў і гародных культур — па 300 цэнтнераў.

З вялікім узнымам удзельнікі нарады паслалі прывітальнае пісьмо правадыру народаў таварышу Сталіну.

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР
Аб назначэнні тав. Гайсіна В. Б. намеснікам Старшыні Совета Народных Камісараў БССР

Назначыць тав. **Гайсіна** Вульфа Борухавіча намеснікам старшыні Совета Народных Камісараў БССР, аслабаніўшы яго ад абавязкаў Народнага Камісара Лясной прамысловасці БССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

9 красавіка 1941 г.
г. Мінск.

Уручэнне грамат Вярхоўнага Совета БССР

7 красавіка ў Прэзідыуме Вярхоўнага Совета БССР адбылося ўручэнне грамат Вярхоўнага Совета Беларускай ССР калектывам дзіцячай творчасці, асобным выканаўцам і кіраўнікам рэспубліканскай алімпіяды дзіцячай творчасці, якая адбылася ў Мінску ў ліпені 1940 года.

Граматы Вярхоўнага Совета БССР атрымалі прадстаўнікі калектываў юных тэхнікаў—авіямадэльнай лабараторыі Цэнтральнай дзіцячай тэхнічнай станцыі БССР, танцавальнага калектыва і лабараторыі выяўленчага мастацтва мінскага Палаца піонераў, вучні школ Мінска: Віктар Галах, Леанід Гімбро, Еўгеній Дзятлаў, Аляксандра Несцерава, кіраўнік дзіцячай капелы гомельскага чыгуначнага клуба імені Леніна М. І. Нікалаевіч і іншыя.

Пасля ўручэння грамат узнагароджаных цёпла віншаваў Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. Я. Наталевіч.

(БЕЛТА).

ВЫТВОРЧА-ГАСПАДАРЧЫ АКТЫЎ НКШЗ

8 красавіка ў Маскве адкрылася нарада вытворча-гаспадарчага актыва Народнага Камісарыята шляхоў зносін СССР. На нараду прыбылі начальнікі чыгунак, палітадзелаў, кіраўнікі служб руху, пуці, вагоннай і паравознай гаспадаркі, грузавой службы, стаханаўцы чыгуначнага транспарта. Прысутнічае больш 1000 чалавек.

З дакладам аб выніках работы чыгуначнага транспарта ў мінулым годзе і задачах палепшання работы ў бягучым годзе выступіў Народны Камісар шляхоў зносін СССР тав. Л. М. Кагановіч.

(ТАСС).

Перадмайскае спаборніцтва

ГОМЕЛЬ, 9 красавіка. (БЕЛТА). На прадпрыемствах горада ўсё больш шырока разгортваецца перадмайскае спаборніцтва. Уключыўшыся ў яго, калектывы фабрык і заводаў дабіваюцца новых вытворчых перамог.

Вялікіх поспехаў у перадсвяточным спаборніцтве дабіліся стаханаўцы «Палесдруку» і тлушчакамбіната. Прыклады высокай прадукцыйнасці працы паказваюць пераплётчыцы фабрыкі «Палесдрук» тав. Мурашка, якая сшывае 48 тысяч сшыткаў пры норме ў 31 тысячу, тав. Бірукова — сшывае 47 тысяч, работніца тав. Палянская, якая фальцуе 11 тысяч сшыткаў замест 7 тысяч па норме, ліноўшчыца тав. Манюк, якая працуе на двух машынах і выконвае норму на 120 процантаў.

Паспяхова працуе тлушчакамбінат, асабліва маргарынавы завод гэтага камбіната. За першы квартал завод выканаў план на 124,4 проц. Калектыў завода абавязаўся ў перадмайскім спаборніцтве выканаць 4-месячны план датэрмінова і даць звыш плана 775 тон высокаякасных тлушчаў.

Абавязацельствы выконваюцца. З першых-жа дзён новага месяца завод працуе планамерна, рытмічна. Пры сутачным заданні ў 44 тоны маргарынавай прадукцыі, за 2 красавіка завод даў 45,2 тоны, 3 красавіка — 48,5 тоны, 4 і 5 красавіка — па 48 тон, а ў апошнія дні завод даў звыш 50 тысяч тон тлушчаў.

СУВЯЗЬ ПРАДПРЫЕМСТВА З АКАДЭМІЯЙ

РЭЧЫЦА, 9 красавіка. (Кар. «Звязды»). Арганізацыі запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік» сістэматычна трымаюць сувязь з ленінградскай Лесатэхнічнай акадэміяй імені Кірава, дзе яны атрымліваюць неабходную тэхнічную кансультацыю.

Гэтымі днямі фабрыку наведаў загадчык кафедры механізацыі запалкавай вытворчасці гэтай Акадэміі дацэнт тав. Каплан. Ён арганізаваў рад тэхнічных кансультацый для начальнікаў цэхаў, майстроў, манцёраў-наладчыкаў і рабочых фабрыкі.

Апрача вусных кансультацый, работнікі фабрыкі атрымліваюць ад навуковых работнікаў акадэміі і пісьмовыя кансультацыі па ўсіх цікавячых і няясных для іх тэхнічных пытаннях.

„Палітычная і соцыяльна-эканамічная літаратура"
(Двухтыднёвы журнал крытыкі і бібліяграфіі)

Літаратурная крытыка і бібліяграфія — адзін з сур'ёзнейшых сродкаў комуністычнага выхавання, прапаганды перадавой тэорыі — вучэння Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. Гэтыя задачы літаратурнай крытыкі і бібліяграфіі не раз падкрэсліваліся ў радзе пастаноў Цэнтральнага Камітэта нашай партыі.

У адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) Інстытут Маркса—Энгельса—Леніна пры ЦК ВКП(б) прыступіў да выдання двухтыднёвага журнала «Палітычная і соцыяльна-эканамічная літаратура». Асноўнае назначэнне журнала — дапамога ў выбары літаратуры, неабходнай для вывучэння марксісцка-ленінскай тэорыі.

У выпаўшым у свет першым нумары журнала змешчаны артыкулы: «Марксісцкая гісторыя філасофіі» — Г. Александрава, «Першы том гісторыі філасофіі» П. Вышынскага, рад артыкулаў па гісторыі, эканоміцы, сусветнай гаспадарцы і сусветнай палітыцы, дан агляд артыкулаў, бібліяграфічная кансультацыя і т. д.

(ТАСС).

МІНІСТР ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ЯПОНІІ п. ЮСУКЕ МАЦУОКА Ў МАСКВЕ

8 красавіка японскі пасол п. І. Татэкава даў абед у чэсць Міністра Замежных Спраў Японіі п. Юсуке Мацуока, на якім прысутнічалі: Старшыня Соўнаркома СССР і Народны Камісар Замежных Спраў тав. В. М. Молатаў, Намеснікі Народнага Камісара Замежных Спраў тт. А. Я. Вышынскі і С. А. Лазоўскі, тав. С. П. Козырэў, тав. В. Н. Баркоў, тав. С. К. Царапкін, а таксама пасол Германіі п. Шуленбург, пасол Італіі п. А. Росо, пасланнік Венгрыі п. Крыштофі, пасланнік Славакіі п. Ф. Тісо, пасланнік Балгарыі п. І. Стаменоў, пасланнік Румыніі п. Г. Гафенку, п. Л. Мапа, п. Г. Тілеў, п. Міхалковіч, п. Ж. Попеску-Паскані і саставы японскага пасольства.

Да ведама дэпутатаў Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных

11 красавіка ў 12 гадзін дня пачынае работу V сесія Мінскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных у памяшканні Дома партасветы.

Сесія абмяркуе наступныя пытанні:

1. Аб бюджэце Мінскай вобласці на 1941 год і выкананне бюджэта за 1940 год.
2. Выбранне саставу Мінскага абласнога суда.
3. Арганізацыйныя пытанні.

ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ МІНСКАГА АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

ТЭЛЕГРАМЫ

К ПРЫБЫЦЦЮ АНГЛІЙСКІХ ВОЙСК У ГРЭЦЫЮ

НЬЮ-ЙОРК, 9 красавіка. (ТАСС). Як перадае афінскі карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс, англійскія войскі, якія прыбылі ў Грэцыю з Афрыкі, па дарозе ў Грэцыю панеслі нязначныя страты. Сярод прыбыўшых войск знаходзяцца лепшыя часці, якія ўваходзілі ў саставу англійскай бліжнеўсходняй арміі. Многія англійскія транспарты па дарозе з Афрыкі падвергліся моцным нападам германскай авіяцыі. Аднак страты нязначныя. Італьянскія самалёты не ўдзельнічалі ў налётах на англійскія транспарты.

НЬЮ-ЙОРК, 9 красавіка. (ТАСС). Афінскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе аб прыбыцці ў розныя грэчаскія порты многіх тысяч англійскіх салдат з вялікай колькасцю механізаванага ўзбраення, харчоў і іншых матэрыялаў. Карэспандэнт заяўляе, што англічане, відаць, рыхтуюцца да працяглай кампаніі.

НАДЗВЫЧАЙНЫЯ КРЭДЫТЫ НА ВАЕННЫЯ ПАТРЭБЫ Ў БАЛГАРЫІ

САФІЯ, 9 красавіка. (ТАСС). Балгарскі ўрад унёс у народнае сабранне (парламент) законапраект аб водпуску надзвычайных крэдытаў на ваенныя патрэбы ў размеры 2.200 мільёнаў леў. Крэдыт разлічан на 3 годы. Адначасова ўрадам унесена прапанова аб водпуску ў бягучым годзе далатковых крэдытаў для дырэкцыі чыгунак у размеры 125.550 тыс. леў. Гэта прапанова таксама матывіруецца ваеннымі патрэбамі краіны.

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ АБ ХОДЗЕ ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯЎ НА БАЛКАНАХ

БЕРЛІН, 9 красавіка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае паведамленне вярхоўнага камандавання ўзброеных сіл Германіі аб тым, што вялікія германскія бронетанкавыя злучэнні занялі горад Салонікі. Грэчаскія войскі, якія знаходзяцца ў Фракіі, паміж ракой Вардар і турэцкай граніцай, адрэзаны.

У другім паведамленні германскага вярхоўнага камандавання ўказваецца, што пасля заняцця праходу Рупель, які ўпорна абараняўся грэкамі, і горада Салонікі, дзейнічаўшая на ўсход ад Вардара грэчаская армія была вымушана скласці зброю.

У паведамленні адзначаецца таксама, што германскія войскі занялі сёння ў Югаславіі горад Ніш. Войскі, якія дзейнічалі ў Штырыі, занялі Марыбор.

ЗВОДКА ВЯРХОЎНАГА КАМАНДАВАННЯ ГРЭЧАСКАЙ АРМІІ

АФІНЫ, 9 красавіка. (ТАСС). Грэчаскае тэлеграфнае агенцтва перадае наступную зводку вярхоўнага камандавання грэчаскай арміі, апублікаваную ўчора вечарам:

8 красавіка на фронце прадаўжаўся моцны націск германскіх войск супроць нашых пазіцый. Аднак спробы праціўніка аказаліся беспаспяховымі. Дзякуючы дзеянням грэчаскіх войск, якія храбра біліся ўжо на працягу двух дзён, усе намаганні праціўніка пацярпелі няўдачу.

У даліне ракі Струма перакрыжаваны агонь з фортаў «Рупель», «Усіта», «Паліурыонес» і «Караташ» утварылі загражэнне, якое праціўнік не мог пераадолець. Асабліва форты «Рупель» і «Усіта» стойка вытрымлівалі ўсю сілу агню праціўніка, а таксама наступленне яго бронетанкавых часцей. Парашутысты, якія былі скінуты праціўнікам за нашымі пазіцыямі, былі знішчаны. Намі ўзята каля 70 палонных. На плато Неўракоп адбываўся жорсткі бой, у якім прымалі ўдзел не толькі сілы нашых фортаў, але і войскі, якія знаходзіліся за фортамі. Форты аказвалі вельмі эфектыўнае супраціўленне. Адзін з нашых фортаў «Дасаўлі», заняты праціўнікам, быў у рэзультаце контратакі неадкладна зноў занят намі. Форт «Ліс» вытрымаў таксама моцны агонь цяжкай артылерыі праціўніка. Нашы часці, якія знаходзіліся за фортамі, у рэзультаце контратакі, зноў занялі некаторыя пункты нашай пазіцыі, якімі праціўніку ўдалося часова заўладаць. На левым флангу нашых пазіцый германскай мотамеханізаванай дывізіі, прапікшай праз югаслаўскую тэрыторыю, удалося вечарам 7 красавіка дасягнуць грэка-югаслаўскай граніцы і заняць Дайран. Раніцою 8 красавіка гэта дывізія ўторглася на нашу тэрыторыю праз праход на ўсход ад ракі Вардар. Вельмі слабыя грэчаскія лёгкія мотамеханізаваныя часці вялі няроўны бой супроць непараўнаўча перавышаючых як па колькасці, так і па якасці сіл праціўніка. Спроба затрымаць праціўніка прадаўжалася некалькі гадзін. Але ўрэшце праціўніку ўдалося прасунуцца ў напрамку Салонік, разарваўшы камунікацыі паміж Усходняй Македоніяй і астатняй краінай.

На албанскім фронце ў рэзультаце наступальнай аперацыі мы занялі новую пазіцыю праціўніка і захвацілі каля 40 палонных, у тым ліку аднаго капітана.

ЗАЯВА РУЗВЕЛЬТА

ВАШЫНГТОН, 9 красавіка. (ТАСС). У гутарцы з прадстаўнікамі друку Рузвельт заявіў, што ён мае намер звярнуцца да кангрэса з прапановай прадаставіць ураду права пакупкі 39 канфіскаваных дацкіх параходаў. Рузвельт указаў, што дацкі пасланнік Кауфман адабрае гэтае рашэнне. Адказваючы на пытанні карэспандэнтаў, Рузвельт указаў, што для набыцця канфіскаваных італьянскіх і германскіх параходаў ЗША скарыстаюць іншыя шляхі.

Далей Рузвельт заявіў, што амерыканская праграма ўзбраення выконваецца паскоранымі тэмпамі. За першыя 3 месяцы 1941 года ўрадавыя расходы на ўзбраенне і ваеннае будаўніцтва складалі 1.800 мільёнаў даляраў супроць 1.400 мільёнаў даляраў за ўсю другую палавіну 1940 года. Адказваючы прадстаўнікам друку, Рузвельт адзначыў, што ЗША апраўляюць у Югаславію ваенныя матэрыялы максімальна быстрымі тэмпамі.

ЗВАРОТ РУЗВЕЛЬТА ДА ЮГАСЛАЎСКАГА КАРАЛЯ

ВАШЫНГТОН, 9 красавіка. (ТАСС). Рузвельт звярнуўся да караля Пятра II з пасланнем, у якім абяцае аказаць Югаславіі ўсю магчымую матэрыяльную дапамогу.

СТАНОВІШЧА Ў БУДАПЕШЦЕ

БУДАПЕШТ, 9 красавіка. (ТАСС). Будапешт усё больш і больш прымае выгляд прыфронтавага горада. Вокны першых паверхаў некаторых дамоў закладзены мяшкамі з пяском. Аўтатранспарт мабілізаван. Аўтобусны рух спынен на 14 лініях. Ноччу горад поўнасцю зацемнен.

Партыйнае жыццё

НА СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫМ СХОДЗЕ СОЎГАСНАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

Пунктуальна ў вызначаны час—к 7 гадзінам вечара — комуністы соўгаса Адаменкі прышлі на свой справаздачна-выбарны сход. Партыйная арганізацыя тут невялікая, — у ёй ўсяго 6 членаў партыі. Усе яны, за выключэннем аднаго таварыша, які адсутнічаў па ўважлівай прычыне, з'явіліся на сход.

Справаздачны даклад зрабіў сакратар партыйнай арганізацыі тав. Лангман. Даклад быў зазіўляюча кароткі; ён заняў усяго-на-ўсяго 10 мінут. Дакладчык проста хутка «прабегся» па ўсіх пытаннях жыцця і работы партыйнай арганізацыі, не прааналізіраваўшы глыбока ні аднаго з іх.

Між тым, аб рабоце партыйнай арганізацыі, у прыватнасці, як яна змагаецца за выкананне гаспадарча-палітычных задач, якія стаяць перад соўгасам, трэба было гаварыць поўным голасам.

Адаменкі — адзін з буйнейшых жывёлагадоўчых соўгасаў Беларусі. Мінулы год быў завершан тут з вялікімі прарывамі. Сярэдні ўдой малака на фуражную карову склаў 1.875 літраў, замест планавых 2 150 літраў. План укамплектавання ферм быў выкананы па буйнай рагатай жывёле на 95.2 проц., па свінях — на 96.8 проц. Меў месца вялікі палзеж маладняка — загінула 30 цялят і 13 парасят. Дзяржаве недадана 892 цнт. малака і 96 цнт. мяса.

Прадукцыя соўгаса яшчэ вельмі дарагая. Сабекошт 1 цнт. малака складае 75 рублёў 72 кап., замест прадугледжаных планам 60 руб. 60 кап. На 264 руб. 60 кап. перавышан таксама планавы сабекошт 1 цэнтнера свінога мяса. Страты соўгаса за мінулы год выражаюцца ў 140 тыс. руб.

Праўда, у першым квартале бягучага года становішча некалькі палепшылася: павялічыўся ўдой малака; выкананы квартальны план па здачы малака і мяса дзяржаве, прычым якасць здаваемага мяса прыкметна павысілася. Соўгас ядрэнна падрыхтаваў да сяўбы.

Аднак у соўгасе прадаўжаецца яшчэ палзеж маладняка. Ужо ў гэтым годзе загінула 24 парасяты з 79. Гэта вынік вялікай скучанасці ў свінарніку, дрэннага догляду парасят.

Дакладчык не ўскрыў прычын дрэннай работы, не ўказаў, што-ж канкрэтна робіць партыйная арганізацыя для таго, каб пераварыць соўгас у рэнтабельную гаспадарку. Некаторыя пытанні былі наогул няправільна асветлены дакладчыкам. Гаворачы аб вядучай ролі комуністаў, тав. Лангман заявіў: «Усе комуністы і ў цэлым партыйная арганізацыя ў вытворчым жыцці соўгаса займаюць авангардную ролю». Гэта не зусім адпавядае сапраўднасці. Брыгадзірам свінаводчай брыгады быў член партыі Туркоў, які не забяспечыў патрэбната кіраўніцтва гэтым важнейшым участкам. У яго брыгадзе ў выніку дрэннай арганізацыі працы меў месца вялікі палзеж парасят. Другі комуніст — брыгадзір першай жывёлагадоўчай брыгады Вараб'ёў 2-га лютага г. г. зрабіў прагул: у сярэдзіне рабочага дня ён кінуў работу і пайшоў п'янстваваць. Праўда, тав. Лангман упамянуў прозвішча Вараб'ёва, але толькі між іншым. З гэтага вынікае, што далёка не ўсе комуністы праяўляюць сваю авангардную ролю.

Даклад вызначыў і характар спрачак — яны былі вельмі вялыя. Комуністы тт. Шыпенкоў, Салаўёў і іншыя ў сваіх выступленнях прааналізілі міма недахопаў работы партыйнай арганізацыі, не ўказвалі на шляхі іх знішчэння. Малазмястоўным было і выступленне дырэктара соўгаса тав. Гузарэвіча. Хоць ён некалькі паўней асвятліў становішча соўгаса, але таксама як след не ўскрыў прычыны вялікага палзежа маладняка і наогул адставання соўгаса. У выступленнях адсутнічала крытыка і самакрытыка.

Нельга сказаць, каб партыйная арганізацыя зусім не займалася вытворчымі пытаннямі, але займалася яна імі павярхоўна, не ўваходзіла ў дэталі вытворчасці, не абмяркоўвала вострых, надзённых пытанняў, якія патрабуюць дзелавога вырашэння. Такія факты, як палзеж жывёлы, пашкоджанне сабекошту прадукцыі і іншыя зусім выпалі з поля зроку работы партарганізацыі.

Лёзнянскі райком партыі слаба дапамагаў комуністам павышаць іх кругазор, не аказваў дастатковай дапамогі ў аўладанні марксісцка-ленінскай тэорыяй (большасць з таварышоў вывучае толькі другі раздзел «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Дарэчы, прадстаўнік райкома, загадчык раённым парткабінетам тав. Пастухоў, нават не палічыў патрэбным дапамагчы партыйнай арганізацыі скласці справаздачны даклад.

Слаба пастаўлена і партыйна-масавая работа ў соўгасе. За ўвесь год партыйная і комсамольская арганізацыі не выраслі ні на аднаго чалавека. Комсамольская арганізацыя налічвае ў сваіх радах толькі 5 чалавек. Насценная газета не выходзіць.

У соўгасе ёсць добрыя стаханаўцы і ўдарнікі. Гэта — даяркі сёстры Голубавы, якія за сваю добрую работу два разы удастоіліся права ўзелу ва Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы і занесены кандыдатамі на выстаўку 1941 года; пялятніца Галубоўская, якая зусім не ведае алькоголю пялят; трактарыст Азаркевіч, які свой план работы заўсёды выконваў на 150—200 проц., і інш. Аднак іх стаханаўскія металы работы слаба перадаюцца астатнім рабочым соўгаса.

Тайным галасаваннем сход выбраў сакратаром партыйнай арганізацыі тав. Лангмана і намеснікам сакратара тав. Гузарэвіча.

З. ЛАРЫСАЎ.

Соўгас Адаменкі,
Лёзнянскі раён.

Партыйны кантроль па-новаму

Абласны тэкстыльна-трыкатажны саюз прыслаў старшыні праўлення арцелі распараджэнне аб выпуску дадатковых відаў тавараў шырокага спажывання. Трэба было асвоіць выраб бумазеі, шарсяных хустак, дзіцячых пярчатак і шаўковых кашнэ.

Раней партыйная арганізацыя арцелі лічыла, што загады Облтэкстыльсаюза датычаць толькі гаспадарнікаў. Як яны выконваюцца, якія меры прымаюцца для іх ажыццяўлення — гэтыя пытанні мала цікавілі партыйную арганізацыю.

Зусім іншае становішча зараз, пасля XVIII партканферэнцыі. Распараджэнне саюза аб дадатковым выпуску тавараў шырспажыва было абмеркавана пярвічнай партарганізацыяй. Мерапрыемствы, якія былі намечаны, дапамаглі праўленню арцелі ў тэрмін і добра справіцца з пастаўленай задачай. Па ініцыятыве партарганізацыі ў арцелі праведзена вытворча-тэхнічная нарада, намеціўшая шляхі асваення новых відаў прадукцыі.

Трэба было, перш за ўсё, устанавіць пяць новых сталкоў. Праўленне даручыла гэту справу начальніку ткацкага цэха т. Астроўскаму. Партыйная арганізацыя паладзіла кантроль за ажыццяўленнем гэтага важнага задання. Станкі былі ўстаноўлены ў тэрмін.

Праверыўшы пасля гэтага становішча цэха, мы ўстанавілі, што для выражэння пастаўленай задачы трэба перабудаваць усю сістэму работы цэха. Пад кіраўніцтвам т. Астроўскага інжынерна-тэхнічныя работнікі заняліся гэтай важнай справай. Цэх разбілі на аддзяленні з аднароднымі станкамі. Адно аддзяленне стала выпускаць матрацную тканіну, другое — хусткі, трэцяе — дарожкі для палогі і т. д. Гэта мерапрыемства дало цэлы рад выгад. Рабочыя сталі спецыялізавацца на адным відзе работы, што павышае якасць прадукцыі і кваліфікацыю рабочых; створаны спрыяючыя ўмовы для планамернай работы строга па графіку.

Пярвічная партарганізацыя строга кантралёе выкананне графіка. Графік у нас уведзен з 1 сакавіка. Пераваг яго сказаліся з першых-жа дзён. Аднак, спачатку быў цэлы рад недахопаў. Сушыльны цэх не забяспечваў ткалкі фарбаванымі пратэівам. Партарганізацыя парэкамендавала гаспадарнікам тэрмінова зрабіць рамонт сушылкі, а ў гэты час частку пратэіва фарбаваць і сушыць у другім цэху — там, дзе робіцца афарбоўка матэрыялаў заказчыкаў. Адначасова мы паставілі пытанне перад Облтэкстыльсаюзам аб бесперабойным снабжэнні сушыльна-фарбавальнага цэха матэрыяламі.

Партарганізацыя абмеркавала работу трыкатажнага цэха. Правялі па гэтаму пытанню партыйна-тэхнічную нараду. Па нашай ініцыятыве ў цэху ўстанавілі дадатковa матальную машыну, якая да гэтага часу стаяла на складзе без справы.

У рэзультаце праведзенага ў цэхах і на складах уліку абсталявання, матэрыялаў, сыравіны выяўлены станкі, інструменты, якія доўгі час ляжалі без карысці. Гэта дало магчымасць устанавіць у трыкатажным цэху дадаткова 4 станкі «Ідэал».

Графік унёс многа новага ў работу арцелі. Зараз выпускаецца 86 розных відаў прадукцыі. План па асартыменту заўсёды выконваецца. Начальнікі цэхаў, майстры, рабочыя ведаюць свае штодзённыя заданні і прымаюць усе меры, каб іх выканаць. У нас не было ні аднаго выпадка, каб вытворчы план не выконваўся.

Ф. М. МАРГАЎЦОВА,
сакратар партарганізацыі магілеўскай трыкатажна-ткацкай арцелі імені Крупскай.

Размовы замест практычнай работы

Кожную раніну сакратар партыйнага бюро станцыі Гомель тав. Веташкін заходзіць да дыспетчара, каб зірнуць на графік, як ідзе работа.

Затым ён накіроўваецца ў наступны пакой да начальніка станцыі т. Азараева.

— Справы ў нас дрэнныя, Міхаіл Васільевіч, — гаворыць ён, — графікі зрываюцца, маруднa ідзе пагрузка.

— Так, дрэнна, — нязменна адказвае начальнік.

У гэтым заключаюцца ўсе клопаты сакратара партыйнага бюро аб рабоце станцыі. Як і раней, т. Веташкін аб усіх справах судзіць толькі па зводках і табліцах. Партбюро не павярнулася яшчэ, як гэтага патрабуюць рашэнні XVIII канферэнцыі ВКП(б), да патрэб і запросаў вытворчасці, не арганізуе бяспрыбы за выкананне вытворчых паказальнікаў. Не дзіўна таму, што станцыя з месяца ў месяц не выконвае сваіх вымяральнікаў і сваёй дрэннай работай нярэдка паралізуе нармальную дзейнасць усёй магістралі.

Рашэнні XVIII канферэнцыі ВКП(б) патрабуюць ад гаспадарнікаў і партыйных кіраўнікоў пакончыць з штурмаўшчынай і аўраламі, дабіцца планавай, рытмічнай, роўнамернай работы. На станцыі Гомель яшчэ правітае штурмаўшчына. Раніца ідзе на раскачку а к канцу справаздачных сутак пачынаецца ліхарадка; пачкамі адпраўляюцца паязды, фарсіруецца пагрузка. Аб'ясняецца гэта тым, што на станцыі адсутнічае якое-б то ні было планіраванне сутачнай і зменнай работы.

Загад наркома абавязвае начальніка станцыі, на аснове атрыманага ад аддзялення плана, складаць сутачны і зменны планы работы станцыі. Але начальнік станцыі комуніст т. Азараў гэтага не робіць. Усё планіраванне цалкам даверана начальнікам змен і дыспетчарам. Гэта вядзе да штурмаўшчыны і аўралаў.

Штурмаўшчына праяўляецца асабліва на пагрузцы і выгрузцы. Начальнік станцыі т. Азараў сістэматычна самавольна зніжае атрымліваемы ад аддзялення план пагрузкі і выгрузкі. 25 сакавіка аддзяленне прапанавала станцыі пагрузіць 100 вагонаў і выгрузіць 275 вагонаў, прычым 40 вагонаў пагрузіць у начны час. Тав. Азараў начную пагрузку знізіў да 25 вагонаў, а фактычна пагружана 17 вагонаў. 26 сакавіка замест 35 вагонаў тав. Азараў запланіраваў 15.

Партбюро і яго сакратар тав. Веташкін, добра ведаючы аб гэтых фактах, нічога не робяць, каб знішчыць іх. Неўмяшанне партарганізацыі ў справы станцыі прыводзіць да сумных рэзультатаў. Планы не выконваюцца. Прастой мяхцовых вагонаў перавышае заданне на 7—8 гадзін, прастой вагонаў з перапрацоўкай перавышае заданне на 4—5 гадзін.

Асноўная прычына маруднай перапрацоўкі вагонаў — гэта нарушэнне тэхналагічнага рэжыма. На станцыі не хапае саставіцеляў. Ёсць нямала спэшчыкаў, якія з поспехам маглі-б працаваць саставіцелямі. Але кіраўнікі станцыі лічаць за лепшае зрываць графік руху паязноў, чым вырашчваць і вылучаць людзей. А партыйная арганізацыя, бачачы гэта, не прымае ніякіх мер. не клапоціцца аб кадрах і іх расстаноўцы.

За апошні час на станцыі сталі больш частымі выпадкі нарушэння графіка па віне тэхнічных канторшчыкаў. 25 сакавіка поезд № 1191 павінен быў ужо адправіцца, калі ў ім заўважылі вагон іншага напрамку. Поезд з-за гэтага пайшоў са спазненнем на 16 мінут. Такіх фактаў многа. Але партыйнае бюро не робіць з гэтага неабходных высноваў. Сярод канторшчыкаў не праводзіцца ніякай палітычнай работы, з імі рэдка гутараць, большасць канторшчыкаў нядаўна працуе на станцыі, адчувае патрэбу ў дапамозе, але яе не атрымлівае.

Такое-ж становішча і з вагаўшчыкамі. Сярод іх не праводзіцца палітычная работа, яны прадастаўлены самі сабе. 24 сакавіка вагаўшчык Раманенка атрымаў распараджэнне заплабіраваць два вагоны, але ён гэта распараджэнне не выканаў і тым сарваў графік. За Раманенка, вагаўшчыком Кавальчуком і іншымі такія факты нярэдка назіраюцца. Усё гэта ў канчатковым выніку прыводзіць да нарушэння тэхналагічнага працэса, зрыву графіка руху паязноў.

Нельга сказаць, каб партбюро не займалася тэхналагічным працэсам. Некалькі месяцаў назад брыгада інжынераў і тэхнікаў прадставіла ў партбюро падрабязны аналіз стану тэхналагічнага працэса, некалькі разоў гэта пытанне разглядалася на пасяджэнні партбюро і на сходах. Але становішча ад гэтага не палепшылася. Выпесеныя рашэнні асталіся не выкананымі. Зараз, рыхтуючыся да вытворча-тэхнічнай канферэнцыі, партбюро зноў зрабіла аналіз ажыццяўлення тэхналагічнага працэса. Але гэтым і абмежавалася.

Партыйнае бюро не дабілася таго, каб комуністы паказалі ўзоры самаадданай работы. Манеўровы дыспетчар комуніст Селікаў нядбайна адносіцца да сваіх абавязкаў, ён нярэдка замазвае недахопы, ашуквае кіраўнікоў станцыі.

25 сакавіка ён адправіў поезд № 1191 са спазненнем на 16 мінут, а ў графіку паказаў, што поезд адпраўлен своечасова. Не служыць прыкладам на вытворчасці і комуніст Полулех. За дрэнную работу ён перамешчан на ніжэйшую пасаду, але і тут нядбайна адносіцца да сваёй работы. Партбюро не прымае рашучых мер да таго, каб забяспечыць вядучую ролю комуністаў на вытворчасці.

Вялікая віна за неадавальняючую работу станцыі Гомель кладзецца на вузлавы партыйны камітэт. Сакратар парткома вузла тав. Грыгор'еў рэдка бывае на станцыі, спакойна адносіцца да факта яе адставання.

Сакратар партбюро тав. Веташкін на кожным кроку прызнаецца, што ён яшчэ не «перабудаваўся». Паўстае пытанне — калі-ж на змену заклінанням прыдуць канкрэтныя справы?

Р. СЫРКІН.

ПРАВЯРАЕМ ВЫКАНАННЕ ПАСТАНОВЫ СНК СССР І ЦК ВКП(б) АБ ПАВЕЛІЧЭННІ ВЫРАБУ ТАВАРАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАННЯ І ХАРЧАВАННЯ З МЯСЦОВАЙ СЫРАВІНЫ

ВЯЛІКІЯ МАГЧЫМАСЦІ І МАЛАЯ ІНІЦЫЯТЫВА

СЛУЦК. (Кар. «Звязды»). У нетрах Слуцкага раёна ёсць велізарныя залежы гліны, мелу і кварцавага пяску. Нямала тут лясоў і тарфяных балот. Раён багат прадуктамі сельскай гаспадаркі. Ёсць многа гародніны, розных фруктаў і ягад.

Прыродныя багацці даюць магчымасць шырока развіваць мясцовую прамысловасць. Аднак, у гэтых адносінах зроблена вельмі і вельмі мала.

Мы паведалі рад магазінаў гор. Слуцка і бачылі ў іх больш за ўсё прывазныя тавары. Вось, напрыклад, магазін пасудна-гаспадарчых тавараў, у ім толькі 4 віды мясцовых вырабаў, астатнія—заваныя. Скрэпкі для бялізны і тыя не мясцовага паходжання. Мясцовыя тавары прадстаўлены ў невялікім асартыменце і выглядаюць вельмі непрывабна. Іх мала хто купляе. За прылаўкам на палозе валяюцца прэцэдуры для вышчкі кандытарскіх вырабаў.

У магазіне гортрэманднля мы бачылі абутак — выраб шавецкай арцелі «Рэкорд». Жаночыя сандалеты зроблены вельмі груба, строчка няроўная, падкладка месцамі закатана наверх. Вельмі неахайна зроблены балеткі і мужчынскія туфлі. На апошніх нават не паказан размер. Пакупніку трэба прымяраць туфлі розных размераў, каб падабраць па назе.

Многія арцелі выпускаюць недобраякасную прадукцыю, не выконваюць плана па асартыменту, але гэта нікога не турбуе. Арцель «Пролетарый» (старшыня арцелі тав. Падліпскі) павінна выпускаць карасінавыя бідоны, лейкі, самаварныя трубы, пёркі, падковы, бабкі, але гэтага яна пакуль не вырабляе.

Мэблевая арцель імені Молатава (старшыня праўлення тав. Рубінчык) вырабляе тое, што ёй выгадна, зусім не лічыцца з патрэбамі і запатрабаваннямі насельніцтва. Вырабляла яна матрацы, якія прадаваліся ў магазінах па 110 рублёў. Матрацы гэтыя раскуплялі вельмі быстра. Зараз кіраўнікі прыдумалі больш складаную «канструкцыю» матраца, і таму адпускная цана павялічана ў тры разы. Натуральна, што гэтыя матрацы перасталі купляць. Але гэта не перашкаджае кіраўнікам арцелі на ўсякіх урачыстых пасяджэннях і нарадах заяўляць, «мы, моў, асвоілі новыя матрацы». Такое-ж становішча і з шафамі. Калгаснікі прад'яўляюць вялікі попыт на плацяныя двухдзверныя шафы, але арцель чамусьці вырабляе няходкія дарагія шафы. Не ізіўна, што ў арцелі стварыліся вялікія залежы няходкіх тавараў, якія ганлюючыя арганізацыі алмаўляюцца прымаць.

У раёне можна выпрацоўваць вялікі асартымент прадуктаў харчавання, як напрыклад, каўбасныя і малочныя вырабы, піва, якое зараз завозіцца з Мінска, і т. д. Вельмі слаба развіты выраб фруктовых вод, перапрацоўка гародніны.

Прайшло каля двух месяцаў пасля XVIII партыйнай канферэнцыі, а ў раёне ўсе яшчэ займаюцца разважаннямі. Ні ў адным прадпрыемстве, ні ў адной арцелі няма сутачнага графіка. Многія партыйныя і гаспадарчыя кіраўнікі нават не ўяўляюць сабе, што такое сутачны графік.

Рад прадпрыемстваў працуе не на поўную магутнасць. Электрастанцыя мае дзве турбіны, з іх працуе толькі адна.

У раёне адчуваецца патрэба ў будаўнічых матэрыялах: у вапне, чарапіцы. Гэтыя матэрыялы з поспехам можна было выраблянь на месцы. Для гэтага толькі патрэбна ініцыятыва. А яе вось і не хапае ў кіруючых работнікаў.

Г. ЛЬВОВА.

У Бабруйск завозяць... драўляныя лыжкі

БАБРУЙСК. (Па тэлефону). У горадзе доўга абмяркоўвалі пытанне аб перспектывах развіцця мясцовай прамысловасці. Звыш трох тыдняў ішлі пасяджэнні, нарады. Нарэшце, план расшырэння выробу тавараў шырокага спажывання быў падрыхтаван.

Тым часам у промарцелях і на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці паспелі забыць аб сваіх абавязацельствах па выпуску тавараў шырокага спажывання. Многія прадпрыемствы і зараз усё яшчэ «асвойваюць» іх выраб.

У арцелі «Чырвоны металіст» тры месяцы робяць штамп для выробу замкоў. У арцелі «Чырвоны мебельшчык» ніяк не могуць асвоіць выраб патэфонных столікаў і этажэрак. На складах арцелі ляжаць толькі ўзоры гэтай прадукцыі.

Не асвоен выпуск чамаданаў, тапароў, драўляных лыжак, дзіцячых цацак і т. д. Ганлюючыя арганізацыі вымушаны завозіць іх з іншых абласцей рэспублікі.

Бабруйск мае ўсе магчымасці для расшырэння выробу прадметаў шырокага спажывання. Усё залежыць пяпер ад кіраўнікоў прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці, ад іх ініцыятывы і настойлівасці.

Х. ГРЫГОР'ЕЎ.

Аб планах і планіраванні

На тэрыторыі Свіславіцкага раёна знаходзіцца лесазавод «Расошак», падпарадкаваны Беластоцкаму лесазагатоўчаму трэсту.

Завод абсталяван навейшай тэхнікай. Пры правільным планіраванні і поўным скарыстанні яго магутнасці ён дасць краіне прадукцыі на мільёны рублёў. Аднак лесазагатоўчы трэст зусім не кіруе прадпрыемствам, не ведае ўмоў яго работы.

На 1941 год заводу запланіравана выпрацаваць на двух шпалярэзных станках 60 тыс. шпал. Гэта—яўна заніжанае заданне. За студзень і люты месяцы завод пры рабоце ў адну змену даў 34 тыс. шпал, і такім чынам выканаў гадавую праграму на 56 проц. Ніякіх іншых відаў прадукцыі не запланіравана. Гэта значыць, што каштоўнае абсталяванне завода не будзе скарыстана.

Не лепш справа з планіраваннем і ў Беластоцкім трэсце Облпродагародніны. Трэст мае тарны завод, які размешчан за 10 кілометраў ад лесу, аднак ён запланіраваў зататоўку лесаматэрыяла для завода за 100 кілометраў ад прадпрыемства, ва ўрочышчы «Чорналессе». Гэта звязана з вялікімі затратамі на перавозкі лесу чыгуначным транспартам. Між тым, лес для Валкавыскага тарнага завода запланіравана загатаўляць на тэрыторыі Свіславіцкага раёна, амаль побач з мясцовым тарным заводам.

Ф. КАВАЛЁЎ.

Новыя кадры інжынераў і тэхнікаў

У вышэйшых і сярэдніх вучэбных установах Наркоммяспрома БССР ідуць падрыхтоўчыя работы да выпуску студэнтаў апошніх курсаў.

Каля 400 інжынераў розных спецыяльнасцей выпусціць мінскі Політэхнічны інстытут. Сярод іх — 113 механікаў, каля 100 будаўнікоў. Мінскі будаўнічы тэхнікум заканчвае 71 чалавек.

Усе выпускнікі накіроўваюцца на работу па спецыяльнасці на прадпрыемствы рэспублікі.

У НОВЫХ КАЛГАСАХ

У адзін з сакавіцкіх дзён на двор калгаса «Чырвоны бераг» (Несвіжскі раён) прышла невялікая група людзей. і нихто асабліва не ззівіўся іх прыходу. Толькі брыгадзір Канстанцін Грыцкевіч, ледзь-ледзь усхваляваны, прыбег да калгаснага кладаўшчыка Паўла Тартускага.

— Праверачная брыгада з «17 верасня» прышла... Як у пябе—усё ў парадку?

— Як быццам усё,—адказаў Тартускі.—Толькі вось з-за ільну крыху сорам на. Ты-ж ведаеш, што ў гумне ў нас ёсць яшчэ няспёрты лён...

— Ну, пяпер не да гэтага,—сказаў Грыцкевіч.—Хадзем, брат, сустракаць гасцей...

Праверачная брыгада складалася з шасці чалавек, прычым у яе ўвайшлі людзі розных прафесій: старшыня калгаса, рахункавод, старшы конюх, каваль, звеннявыя. Яны з'яўляліся прадстаўнікамі суседняга з «Чырвоным берагам» калгаса імені 17 верасня. Паміж калгасамі яшчэ з мінулага года пачалося ажыўленае спаборніцтва на лепшую работу, і праверачныя брыгады час-ад-часу наведвалі суседа, наведвалі змаль заўсёды нечакана. Так было і на гэты раз.

— Адкуль пачнем?—запытаў старшыня калгаса імені 17 верасня Емельян Рыжэўскі, які ўзначальваў праверачную брыгаду.

— Гэта ўжо ваша справа,—скромна адказаў старшыня правяраемага калгаса Владзімір Мядзведскі. — Давайце з канюшні, ці што...

— Правільна, з канюшні,—горача падтрымаў конюх з калгаса імені 17 верасня, яўна спадзеючыся знайсці што-небудзь на канюшні, каб запісаць у акт.

Але азнаямленне з канюшняй не толькі не выклікала ў старога конюха калгаса імені 17 верасня крытычных заўваг, а, наадварот, выклікала захапленне і прымусіла пазайздросціць. У абодвух будынках, адведзеных пад канюшні, правяраючыя заўважылі чыстату і парадак. Яны ўбачылі ўкормленых, вычышчаных, моцных коней, якіх можна было хоць сёння запрагаць у плуг ці барану. У кожнай дробязі, нават у тым, як акуратна закладвалася сена ў кармушкі, або налівалася пойла ў карыты, можна было бачыць сляды руплівых рук.

— Э, бачыш, Курачыцкі,—сказаў Рыжэўскі свайму конюху.—Тут, брат, варта павучыцца і табе...

— Не адмаўляю, — згадзіўся той і дадаў як-бы ў сваё апраўданне:—Яно-ж на тое і спаборніцтва, каб вучыцца і дапамагаць адзін аднаму...

З канюшні правяраючыя прайшлі па свірнах. Тут таксама нельга было прычапіцца да чаго-небудзь. Адсартаванае насенне ляжала ў вялікіх засеках або ў акуратных буртах на падлозе, і над кожным буртам была дошчачка з надпісам, што за насенне, колькі яго і якая ўсхожасць. Рыжэўскі, убачыўшы бурт залацістага буйнага аўса 98-процантнай усхожасці, не прамінуў запытаць у Мядзведскага, ці няма ў яго запасу, каб абмяняць свой некандыцыйны авёс на гэты. і вельмі ўзрадваўся, калі Мядзведскі сказаў, што ў яго ёсць яшчэ дастаткова такога-ж аўса і для абмену.

Правяраючыя пайшлі далей па ўсіх закутках калгаса. Яны доўга аглядалі работу кавалёў у кузні і заўважылі, між іншым, што хоць калёсы, напрыклад, адрамантаваны, але стаяць яны пад адкрытым небам, заносяцца снегам, іржавеюць шыны ў іх, псуюцца колы. Не прайшло міма іх увагі і тое, што некалькі плугоў і боран стаялі яшчэ неадрамантаванымі. Усё гэта рахункавод калгаса імені 17 верасня занёс у запісную кніжачку, каб потым сказаць на агульным сходзе калгаснікаў, які павінен быў адбыцца ў гэты-ж вечар.

Агледзеўшы ўсё, што звязана з падрыхтоўкай да сяўбы, члены брыгады пацікавіліся ільном: якое валакно атрымаў калгас у мінулым годзе? Тут, праўда, здарыўся канфуз для калгаснікаў «Чырвонага берага». Члены камісіі раптам заўважылі, што знік брыгадзір Грыцкевіч, а з ім і кладаўшчык. Рашылі пайсці самі на гумно. Аказалася, што і брыгадзір, і кладаўшчык знаходзяцца там. Гэта выклікала падазрэнне. Адзін з правяраючых капнуў салому ў кутку гумна і з-пад яе паказалася ільнотраста.

— Што-ж гэта вы,—сурова сказаў Рыжэўскі. — Не змялі трасту, дык хаваеце яе? Нядобрасумленна. Сябе-ж ашукваеце, а не нас...

Грыцкевічу і старшыні калгаса «Чырвоны бераг» прышлося парадкам пачырванець. Правяраючыя заўважылі ім, што социялістычны дагавор паміж калгасамі заключан не для таго, каб хваліцца сваімі поспехамі і ўтойваць недахопы, а для таго, каб сумесна знішчаць недахопы і пераймаць адзін у аднаго лепшы вопыт.

Потым члены праверачнай брыгады і калгаснікі з «Чырвонага берага» зайшлі ў канцылярыю. Невялікі пакой у хаце Владзіміра Мядзведскага запоўніўся людзьмі. Задымілі цыгаркі, пачулася ажыўленая гутарка. Пакуль рахункавод калгаса імені 17 верасня капаўся ў кнігах свайго калегі з «Чырвонага берага», калгаснікі суседзі загаварылі пра нядаўняе мінулае, пра сённяшняе і пра недалёкую будучыню. Гаварыць жа сапраўды было аб чым было што ўспомніць.

Абодва калгасы-суседзі існуюць усяго нямногім больш года. Асноўнае ядро ў іх склалася з нядаўніх панскіх батрачкоў. Калі прышла сюды, у Заходнюю Беларусь, Чырвоная Армія і ў краі, вызваленым ад прыгнёту паноў і капіталістаў, устанавілася совецкая ўлада, батракі паноў Ратынскага і Абуховіча рашылі аб'яднацца ў калгасы. Неўзабаве да іх далучылася частка беднякоў і сераднякоў з суседніх вёсак. Так узніклі калгасы імені 17 верасня і «Чырвоны бераг».

З таго часу многа падзей адбылося ў жыцці былых батракоў і беднякоў. Яны і раней крыху чулі пра калгасы, але не верылі, што калектыўнае жыццё прынясе столькі радасці.

Кулакі і розныя падпанкі яшчэ мінулым летам распускалі чуткі, што вось вы будзеце, моў, працаваць ад рання да ночы, а хлеба наўрад-ці атрымаеце больш, чым атрымлівалі ў пана.

Владзімір Мядзведскі ўспамінае, як яго бацька—Ілья—цяперашні знатны жывёлавод калгаса, спрадвечны батрак у мінулым, прышоў да свірна ў часе выдачы па працадні з трыма невялікімі мяшкамі «Хоць-бы гэтыя мяшкі насыпалі, і то ладна»—разважаў ён. Кладаўшчык прачытаў у спіску, што Ілья Мядзведскі выпрацаваў з сям'ёй каля тысячы працадзён і яму належыць атрымаць 360 пудоў збожжа і 9 з палавінай тон бульбы.

Старык стаяў разгублены і не верыў, што гэта можа быць у сапраўднасці. «Навошта-ж мне так многа?—запытаў ён.—Ды і куды я падзену ўсё гэта?» Потым, убачыўшы, што ніхто з ім не збіраецца жартаваць, а гаворыцца ўсур'ёз, ён звярнуўся да кладаўшчыка: «А што, калі я не забяру сёння ўсё збожжа?». «Ну, што-ж,—сказаў кладаўшчык,—забярэце потым, дзед Ілья, у калгасе не прападзе».

Усё гэта было так нечакана і нова, што многія дзівіліся, — ява гэта, ці сон? Ну вось, скажам, пажылая калгасніца Елена Герасімовіч—таксама былая батрачка. У яе восем дзяцей. Мужа няма. Што-ж аставалася-б рабіць ёй пры польскіх панах? Хоць самагубствам канчай. А тут яна з трыма дзецьмі добрасумленна працавала ў калгасе, зарабіла паралкам працадзён, ды яшчэ атрымала дзве тысячы рублёў па многасямейнасці, і жанчына добра жыве, не баючыся ні за свой лёс, ні за лёс дзяцей.

Такія змяненні адбыліся ў жыцці маладых калгаснікаў. Важкі працадзень, усведамленне таго, што будучыня абяцае яшчэ лепшае жыццё, з'явілася самым пераканаўчым абвяржэннем кулацкіх плётак. Нават тыя, хто адлыньваў ад работы, або працаваў нядобрасумленна, пасля размеркавання ўраджаю сталі іншымі людзьмі. Зімой ужо старшыня і брыгадзір не чулі адмаўленняў ад работы. Наадварот, кожную раніцу на калгасным дварэ збіраліся калгаснікі і патрабавалі даць ім работу. «Не можа быць,—гаварылі яны брыгадзіру,—каб у такой гаспадарцы, як наша, не хапала работы».

У той дзень, калі прышла праверачная брыгада, калгаснікі вывозілі гной на палі, выязджалі ў лес за бярэннем, рамантавалі абору і канюшню, перавозілі корм з дальніх стагоў. Адразу кідалася ў вочы, што і ў гэты халодны сакавіцкі дзень у калгасе кіпіць жыццё, ідзе ўпорная работа.

— Якія-ж у нас планы?—гаварыў брыгадзіру старшыня калгаса «Чырвоны бераг» Владзімір Мядзведскі... —У мінулым годзе мы з плошчы ў 178 гектараў атрымалі па 14 цэнтнераў збожжа з гектара. За гэта наш калгас зацвердзілі ўдзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. А сёлета мы даб'емся не менш 17 цэнтнераў з гектара. Як ты думаеш, Грыцкевіч, — звярнуўся ён да брыгадзіра, — стрымаем слова?

— Не можа быць і сумнення,—сказаў Грыцкевіч.—Насенне ў нас добрае, гной ужо заканчваем вывозіць, коні ў целе, і галоўнае, у людзей настрой вылатны.

— Што яшчэ мяркуем, — прадаўжаў Мядзведскі.—Вунь за выганам пачынаецца балотная іншарына. Прыступім да асушкі яе. Гэта будзе добрых сотня гектараў выдатнейшай зямлі. Ну, а ўнутры калгаса ў нас цэлы рад бягучых будаўнічых работ—і па рамонту старых будынкаў, і па пабудове новых. Рашылі вось пташкаферму арганізаваць, свінарнік расшырыць, новую абору будаваць. Трэба-ж мець на ўвазе, што не сёння, дык заўтра далучыцца да нас не адзін дзесятак гаспадараж вось з тых хутароў — паказаў ён праз акно на раскіданыя воддаль хаціны суседніх вёсак.

Старшыня калгаса імені 17 верасня Емельян Рыжэўскі расказаў чырвонабярэжцам пра свае планы. У яго таксама было нямала цікавых намёткаў на гэты год. У маладых калгасаў ужо накапіўся некаторы вопыт і ён павінен паслужыць асновай для далейшых поспехаў.

Адвячоркам на сваім агульным сходзе чырвонабярэжцы абмеркавалі вывады праверачнай брыгады. Брыгада прызнала, што калгас падрыхтаван поўнасцю да сяўбы, але разам з тым адзначыла рад дробязных, на першы погляд, але маючых нямалае значэнне непаладкаў.

— Цяпер за вамі чарга,—па-сяброўску сказаў на сходзе Рыжэўскі.—Прыязджайце да нас, азнаёмцеся з нашымі справамі...

Праз некалькі дзён, калі ў «Чырвоны бераг» выпадкова заехаў загадчык райземаддзела Владзімір Мядзведскі, —мы рашылі па праўленні паслаць камісію ў калгас імені 17 верасня. Хай паглядзяць, можа што падскажуць ім, а можа чаму-небудзь павучацца... Сяўба не за гарамі. А настрой у калгаснікаў бавы.—дадаў ён.—Ведаюць, што, калі працавітай будзе вясна, дык багатай будзе восень...

Тар. ХАДКЕВІЧ.

РАЗГОРТВАЕМ МАСАВЫЯ МЕЛІЯРАТЫЎНЫЯ РАБОТЫ

Гістарычная пастанова партыі і ўрада аб асушэнні балот у Беларускай ССР сустрэта калгаснікамі раёна з вялікім узрымам. Яны абавязаліся асушыць сёлета 4.800 гектараў і асвоіць 3.000 гектараў балот і забалочаных зямель.

Адразу-ж ва ўсіх калгасах была разгорнута дзейная падрыхтоўка да меліяратыўных работ. У калгасе «Чырвоная Гусараўка», не чакаючы вясны, пачалі пракладку магістральнага канала і асушальнай сеткі. Партыйная арганізацыя аказала чырвонагусараўцам усямерную дапамогу, стварыла ўсе ўмовы для пашырэння іх вылатнага пачыну.

20 сакавіка на абласной нарадзе перадавікоў сельскай гаспадаркі чырвонагусараўцы расказалі аб сваім вопыце меліяратыўных работ у зімовых умовах. Нарада ўхвалила іх вылатны пачын. Абком партыі зобавязаў партыйным і савецкім арганізацыям па прыкладу чырвонагусараўцаў разгарнуць масавыя меліяратыўныя работы ў кожным калгасе, на кожным балотным масіве.

Прыклад чырвонагусараўцаў жыва падхапілі дзесяткі калгасаў. Дзевяць калгасаў Забалоцкага сельсовета разам з «Чырвонай Гусараўкай» пачалі пракладку Лукскага магістральнага канала і асушальнай сеткі. Больш 100 калгаснікаў сельгасарцелі «Ленінскае жыццё», Дварэцкага сельсовета, штодзённа занята на пракладцы асушальнікаў да ўчастка Лукскага канала, які пракладзен яшчэ ў мінулыя гады.

Масавыя меліяратыўныя работы разгарнуліся ў калгасе «Чырвоны прамень», Лучынскага сельсовета. На балоце штодзённа занята 140—150 чалавек. Імі пракладзена ўжо каля 400 пагонных метраў асушальнікаў. Таксама паспяхова разгортваюцца масавыя меліяратыўныя работы ў калгасе «Хваля», Крушынаўскага сельсовета.

Пачалі асушку балот калгасы «13 год Кастрычніка» і «Чырвоная Дуброва», Гадзілавіцкага сельсовета. Гэтыя калгасы яшчэ ў 1940 годзе на асушаных балотах атрымалі высокія ўраджаі кок-сагыза — 45 цэнтнераў сырога карэння з гектара. Не менш інтэнсіўныя меліяратыўныя работы разгорнуты ў калгасах Старасельскага і Піхінішкага сельсоветаў.

Зараз на асушцы балот занята каля 25 калгасаў. Імі ўжо пракапана 900 пагонных метраў Лукскага магістральнага канала і 3.400 метраў асушальнікаў. Кожны дзень прыносіць усё новыя і новыя перамогі, калгасы адзін за адным уключаюцца ў масавае наступленне на балоты.

У нас ёсць усе магчымасці з чэсцю выканаць узятыя абавязацельствы. Дзяржава аказвае усямерную дапамогу як грашыма, так і меліяратыўнымі машынамі. Арганізоўваецца спецыяльная меліяратыўная МТС. На рэгуліроўцы і паглыбленні водапрыёмніка ракі Добрыцы будуць прапавать магутныя машыны — экскаватары.

Зараз мы прымаем усе меры, каб забяспечыць патрэбнай тэхнічнай дапамогай калгасы якія заняты на меліяратыўных работах. Комуністы паўсямесна ўзначальваюць вылатны рух калгаснікаў за ператварэнне балот у квітнеючыя калгасныя палі і сенажаці.

Л. В. ЗАЙЦАЎ,
сакратар Рагачоўскага РК КП(б)Б.

Новы прыліў у калгасы

БАРАНАВІЧЫ. (Кар. «Звязды»). Гістарычныя пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў за павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі і аб асушэнні балот у Беларускай ССР выклікалі масавы прыліў сілян у калгасы.

Члены сельгасарцелі імені 17 верасня, Беліцкага сельсовета, Ліскага раёна, прынялі ў сваю сям'ю 10 аднаасобных гаспадарак. Новаўступіўшыя ў калгас абагулілі сваю маёмасць і прыступілі да работы ў калектыўнай гаспадарцы.

З радасцю ідуць у калгасы сяляне-аднаасобнікі Сяньковіцкага сельсовета. У калгас «Комунар» за апошнія дні ўступіла 19 сямей аднаасобнікаў, 14 гаспадарак прынята ў калгас «Большэвік» і 18 гаспадарак—у калгас імені XVIII партыйнага з'езда.

35 заяў аб жаданні працаваць у калгасе паступіла ад сялян-аднаасобнікаў Плепяніцкага сельсовета.

У многіх вёсках прапоўныя сяляне, пераканаўшыся ў правільнасці калгаснага шляху, просяць арганізаваць калгасы. Так, сход сялян вёскі Угрынь Осіпаўскага сельсовета Ліскага раёна пастанавіў правесці калектыўнае асушэнне і асваенне балот. У вёсцы Быкавічы Мірскага раёна пасля актыўнага абмеркавання пастановы партыі і ўрада аб асушэнні балот арганізавана сельскагаспадарчая арцель. Маладыя калгаснікі ўжо абагулілі коней, сельгасінвентар і рыхтуюцца да палыходзячай веснавой сяўбы.

Масавы прыліў у калгасы назіраецца ў Слопімскім раёне. За апошні час арганізавана 12 новых калгасаў. Выбраны праўленні. Зараз заканчваецца абагуленне маёмасці, насенных матэрыялаў і сродкаў вытворчасці.

Сталі на шлях калгаснага жыцця 37 аднаасобных гаспадарак вёскі Пераносіны Палопкаўскага сельсовета Нова-Мышскага раёна. Сваю сельгасарцель яны назвалі іменем вялікага пролетарскага свята—Першае мая.

В палёў Беластоцкай вобласці сышоў снег. Старшыня калгаса «Свабодная Беларусь» (Гродненскі раён) М. Носка і калгаснік Г. Вайновіч аглядаюць азімыя пасевы.
Фото С. Ангарскага. (БЕЛТА).

ВЯСНА НЕ БУДЗЕ ЧАКАЦЬ

КРУПКІ. (Кар. «Звязды»). Крупскі раён — адзін з адстаючых у Мінскай вобласці. Штогод тут праводзяць са спазненнем важнейшыя гаспадарчыя мерапрыемствы. Летась веснавая сяўба прадаўжалася больш месяца.

Нарушэнне ўрадавых тэрмінаў сяўбы і асноўных правілаў агратэхнікі адмоўкі глебы сказаліся на ўраджайнасці. У мінулым годзе калгасы раёна сабралі ў сярэднім зерневых 6,8 цэнтнера і бульбы 126 цэнтнераў з кожнага гектара. Калгас імені Варашылава, Крупскага сельсовета, летась атрымаў ураджай зернавых толькі 6,7 цэнтнера, а сельскагаспадарчая арцель «Прасвет», Шэйскага сельсовета, — 5,6 цэнтнера з гектара.

Старшыня выканкома райсовета тав. Каган і сакратар райкома КП(б)Б тав. Русінаў не толькі не ўлічылі мінулагодніх памылак а, наадварот, паглыбляюць іх. У кіраўнікоў раёна ўвайшло ў прывычку адставаць, зацягваць сельскагаспадарчыя работы. Яны прымірыліся з недахопамі.

У некаторых калгасах («Чырвоная зорка», імені Будзённага, «Чырвоны баец» і інш.) не хапае насення. Адпушчаныя дзяржавай 260 цэнтнераў насення канюшыны і 1820 цэнтнераў ільнонасення ляжаць на складзе «Заготлён». Да гэтага часу калгасы ўзялі ільнонасення ўсяго 5 цэнтнераў і канюшыны 53 цэнтнеры.

Яшчэ горш з якасцю насення. У 57 калгасах зярно некандыцыйнае па ўсхожасці. Напрыклад, у сельгасарцелі «Праўда», Ігрушацкага сельсовета, усхожасць насення аўса складае ўсяго 38 проц., пшаніцы — 40 проц. і ячменю — 63 проц. Такі-ж малюнак і ў астатніх калгасах. Абмен некандыцыйнага насення ідзе выключна дрэнна. З 57 калгасаў па абмену прыступілі толькі 27. Асабліва дрэнна абстаіць справа з міжкалгасным абменам. Пры плане ў 1147 цэнтнераў абменена ўсяго 222 цэнтнеры. У калгасе «Звязда», Бобрскага сельсовета, амаль усё насенне не адпавядае пасеўным кандыцыям, аднак, абмен яго не распачат. З 7 калгасаў Жаберыцкага сельсовета абмен пачалі ўсяго тры калгасы. Буйнейшы калгас «Шлях Сталіна», Ігрушацкага сельсовета, па плану сёлета павінен пасеяць 628 гектараў яравых культур, аднаго ільну неабходна пасеяць 100 гектараў. А насенне, якое ёсць у калгасе, некандыцыйнае. Усхожасць пшаніцы — 61 проц. Праўленне сельгасарцелі як-быццам распачало абмен нядобраякаснага насення на чыстасортнае. Завезена каля 70 цэнтнераў ячменю добрай якасці, але змясцілі яго ў свіран з дзіравым дахам, у выніку зярно мокне і псуецца.

У калгасы завезена ўсяго 704 тоны мінеральных угнаенняў пры плане ў 1085 тон, а між тым, на станцыі Крупкі ляжыць пад адкрытым небам больш 318 тон. Калгасы Ухвальскага сельсовета завезлі ўсяго 9 тон мінеральных угнаенняў. Такі-ж малюнак у Шынкоўскім, Жаберыцкім і іншых сельсоветах. Не выканан план вывазкі на поле гною, торфу і накаплення мясцовых угнаенняў.

Не падрыхтавана да веснавой сяўбы і цягавая сіла. Тут з года ў год па-варварску эксплаатыруюцца коні. Аб гэтым гаворыць такі факт. Летась абартывалі 63 конематкі. За тры месяцы гэтага года абартывалі 9 конематак. У сельгасарцелі «Шлях Сталіна», Ігрушацкага сельсовета з 130 рабочых коней —40 змораных, а астатнія ніжэй сярэдняй укормленасці. У калгасе «Маяк соцыялізма», Шынкаўскага сельсовета (старшыня калгаса Кухлеўскі), коні не замапаваны за брыгадамі і калгаснікамі, на канюшні пануе абязлічка, коні не чысцяцца, вупраж не палагнана.

Загадчык райза тав. Мацкевіч і галоўны аграном тав. Імшанецкі не дапамагаюць калгасам у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. У калгасах яны бываюць вельмі рэдка.

Ф. РУЦКІ.

ЖЫЦЦЁ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

На тактычных заняткох у II-скай часці ЗахАВА. Агітатар—выдатнік вучобы М. Сяргееў гутарыць з байцамі аб маскіроўцы. (Фото БЕЛТА).

У ПАЛЯВОЙ АХОВЕ

Узыходзіла сонца. Вясёлыя праменні яго купаліся ў воднай гладзі звіваючайся вогненай змяёй рэчкі. На край лесу, што ўпіраецца ў самае русла рэчкі, прыбыло аддзяленне пад камандай малодшага сержанта Іванова для адпрацоўкі тэмы «Аддзяленне ў палявой ахове». Камандзір аддзялення, быстра выстраіўшы байцоў, пачаў аддаваць загад:

— «Праціўнік» сілай да батальёна сканцэнтраваўся ля вёскі І. Справа ад нас — палявая ахова № 1, злева — палявая ахова № 3. Наш узвод складае старажавую заставу. Наша аддзяленне назначана ў палявую ахову № 3 з задачай — своечасова выявіць паяўленне «праціўніка» ў паласе: левы край гаю — ветраны млын, і папярэдзіць аб гэтым старажавую заставу. На вартавы мост ідуць: першая змена — Кобец, Скачко; другая змена — Туміловіч, Кузмянок; трэцяя змена — Смоліч, Суржыцкі. Сігнал аб паяўленні «праціўніка» — падняць дзве рукі. Пропуск — «штык».

Пераканаўшыся, што загад зразуметы байцамі, тав. Іваноў пачаў размяшчаць палявую ахову. Ядро аховы па яго загаду заняло абарону на скаце вышыні 132,2, адкрыўшы агонь лежачы. Старажавы пост: часавы Кобец, падчасак Скачко, — камандзір размясціў у невялікіх седлавінах, акаймлёных хмызняком; адсюль адкрываўся від далёка ўперад. На бірузовым фоне неба ясна і рэльефна выступалі востраверхі гай, вятрак са скрыжаванымі крыламі, контуры вёскі, дзе, па даных паветранай разведкі, сканцэнтраваўся «праціўнік». Зрабіўшы першы развод, тав. Іваноў вярнуўся ў ядро. Людзі ўсе на сваіх месцах; ручны кулямёт і стралкі гатовы к «бою». Тады ён выклікае да сябе байца тав. Бажэнка і загадвае яму: непрыкметна пранікнуць у распалажэнне ахоўваемага падраздзялення.

І вось відаць, як тав. Бажэнка з усёй сур'ёзнасцю, лавіруючы сярод дроў і кустоў, укрываючыся ў лагчынах і ўпадзінах, умела прабіраецца да паласы ахоўваемага раёна. Па роўнай мясцовасці тав. Бажэнка прасоўваецца толькі «пластунску». Шчытна прыціскаючыся да зямлі, тав. Бажэнка метр за метрам адваёўвае шлях, бліжэй падкрадваецца да «праціўніка».

Прадстаіць перабрацца праз маленькі ўзгорак. У грудзях моцна стукае сэрца. Бажэнка ўжо знаходзіцца вельмі бліжа ад вартавога. Ён рыхтуецца да рашучага браска. Але дарэмна. Пільны вартавы тав. Кобец раптоўна вырастае перад «праціўнікам», і піха, але рашуча аклікае яго:

— Стой! Пропуск!

«Праціўнік» маўчыць.

— Рукі ўверх! — цвёрда загадвае яму вартавы.

— Кругом, — прадаўжае тав. Кобец.

— Ні з месца! «Прыстралю»!

— «Праціўнік» замёр, ляжыць нерухома...

З ядра з напружанай увагай сачыў за дзеяннямі байцоў начальнік палявой аховы тав. Іваноў. Усе байцы дзейнічалі граматна, умела і пільна.

Малодшыя сяржанты:
Сцяпан НАУМЕНКА,
Васілій МАКЕЕЎ.

ЕФРЭЙТАР СЯРГЕЙ ГАЎРЫЛАЎ

Ён прыбыў у падраздзяленне лейтэнанта тав. Лысюка восенню 1939 года. Успамінаецца першая сустрэча і размова.

— Якую вы маеце спецыяльнасць? — спытаў лейтэнант Лысюк.

— Токар, працаваў на Арэхава-зуеўскім заводзе, — адказаў Гаўрылаў.

— Якую ваенную спецыяльнасць жадаеце набыць?—спытаў Лысюк, падкрэсліваючы слова «ваенную».

Стройны, рослы і вясёлы малады баец на імгненне прызадумаўся, твар яго стаў сур'ёзным, а вочы прагна ўглядаліся ў той кут, адкуль паблісквала сталь зброі.

— Таварыш лейтэнант, хачу аўладаць спецыяльнасцю станкавата кулямётчыка. — адказаў тав. Гаўрылаў.

Яго гарачае жаданне аўладаць гэтай грозпай зброяй было задаволена. Пачалася вучоба. Заўсёды можна было бачыць Гаўрылава за кулямётам. Ён старанна вывучаў і клапатліва даглядаў яго. Прыходзіць, бывала, з тактычных заняткаў, уважліва аглядзіць, змажа кулямёт.

Гаўрылаў не саромецца звярнуцца за дапамогай, уважліва прыслухоўваецца да голасу камандзіраў і прыглядаецца да іх дзеянняў. Ён стаў вылатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі, паспяхова здаў экзамен на ефрэйтара і зараз камандуе аддзяленнем.

Добра ўладаючы сваёй спецыяльнасцю, Гаўрылаў умее быстра падмячаць недахопы ў вучобе сваіх падначаленых. Чырвонаармеец Дабрагін навучыў кулямёт у цэль за адну мінуту. Гэта вельмі вялікі час. Прычына заключалася ў тым, што Дабрагін, замацоўваючы механізмы, ставіў прыцэльныя прыстасаванні адной рукой і сачыў у гэты час не за «праціўнікам», а за дзеяннем сваёй рукі.

Гаўрылаў расказаў і паказаў байцу, як трэба дзейнічаць.

— Дайце мне, цяпер я сам усё гэта прараблю,—радасна гаварыў Дабрагін. Пасля ўпорнай і настойлівай трэніроўкі Дабрагін навучыўся наводзіць у цэль кулямёт за 17—20 секунд.

Не толькі Дабрагін, але і ўсе байцы аддзялення Гаўрылава зараз з'яўляюцца вылатнікамі баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Аддзяленне трымае пяршынства ў часці ў соцыялістычным спаборніцтве.

І. С. ЧЭПІК,
намеснік палітрука.

Бібліяграфія

БОЛЬШ КАЎЧУКА РОДНАЙ КРАІНЕ!

Больш каучука роднай краіне! Комсамольцы, моладзь — на бараньбу за высокі ўраджай кок-сагыза! — такім заклікам азаглаўлен выдадзены Дзяржаўным Выдавецтвам пры СНК БССР мастацкі плакат пра кок-сагыз. Пад малюнкам з ярказялёнай ліствой кок-сагыза ў цэнтры плаката дэманстрыруецца прадукцыя гэтай невялікай каучуканоснай расліны: пакрышкі і камеры, гумавыя боты і рукавіцы, галошы і пратівагазы. Фото злева і справа аллюстроўваюць ролю кок-сагыза ў абароне краіны.

Спісла і папулярна расказваецца ў плакаце пра шэфства комсамола над кок-сагызам, пра велізарную ролю ў народнай гаспадарцы і ў абароне краіны каучука, з якога робіцца звыш 40 тысяч розных відаў гумавых вырабаў.

Артыкул «Кок-сагыз — наш каштоўнейшы каучуканос» заканчваецца парадамі, як вырошчваць высокапрадукцыйны сорт кок-сагыза. «Кок-сагыз — яшчэ дзікая расліна і таму дае ў сярэднім невялікі корань — 10—15 грамаў вагой. Але ў культуры на добрай глебе часта сустракаюцца карэнні ў 30—40, а іншы раз нават больш 100 грамаў вагой. Трэба дабіцца, каб усе карэнні з пасеваў былі ў 40—50 і больш грамаў. Гэтым мы значна павысім ураджайнасць пасеваў кок-сагыза.

Як гэта зрабіць? Трэба выбраць буйныя і багатыя каучуком карэнні, высадзіць іх асобна і сабраць з іх насенне. Затым высеяць гэта насенне і зноў выбраць самыя лепшыя карэнні для атрымання палепшанага насення».

На якіх глебах лепш сеяць кок-сагыз, як даглядаць пасевы, каб атрымаць найбольшы ўраджай карэнняў? На гэта пытанне аўтары плаката тт. Б. Мешачок, Б. Бельскі і В. Карпілаў адказваюць у кароткім і папулярным артыкуле «Як атрымаць высокі ўраджай кок-сагыза». Яны расказваюць пра спосабы пасеваў кок-сагыза на асушаным балоце. Тут пралутледжваецца і ўзровень грунтовых вод, і тэрміны сяўбы ранняй вясной. І ўгнаенні, якія ўжываюцца пад гэту культуру. У раздзеле «Як атрымаць высокі ўраджай кок-сагыза на мінеральных глебах» аўтары плаката расказваюць, як апрацоўваць глебу пад кок-сагыз, як даглядаць і падкармліваць пасевы і чаму трэба пакідаць лепшыя ўчасткі пад насеннікі.

У плакаце аллюстраван пачын заснавалаў высокіх ураджаяў кок-сагыза — комсамольцаў і ўсёй калгаснай моладзі сельгасарцелі «XIII год Кастрычніка» Рагачоўскага раёна і 5 маладых калгаснікаў сельгасарцелі «Зара комуны» Любаньскага раёна, якія ў 1940 г. атрымалі да 70 цнт. карэнняў кок-сагыза з 1 гектара.

Мастацкі плакат, выданы Дзяржаўным выдавецтвам тыражом у 6 тыс. экземпляраў, рассылаецца ў калгасы рэспублікі. Ён дапаможа звеннявым і брыгадзірам у іх бараньбе за высокі ўраджай каштоўнейшай культуры — кок-сагыза.

Новыя кнігі

М. Зошчанка. «Апавяданні пра Леніна» (пераклад з рускай мовы). Кніга разлічана на дзяцей дашкольнага ўзросту. У маленькіх апавяданнях: «Як Ленін вучыўся», «Як Ленін кінуў курыць», «Апавяданне пра тое, як Ленін перахітрыў жандараў»; «Пчолы», «Паляванне», «Графік» і інш. аўтар расказвае пра дзіцячыя гады вялікага правадыра.

Кніга выйшла тыражом у 10.000 экз. і каштуе 1 р. 45 кап.

Эдуард Багрыцкі. «Выбранае» (на рускай мове). Том твораў выдатнага савецкага паэта ўключае ў сябе поўнасцю кнігу «Апошняя ноч», раздзелы з кніг «Паўднёвы захал» і «Пераможцы», а таксама асобныя паэмы і вершы, напісаныя ў перыяд ад 1915 па 1926 гг. Тыраж кнігі 8000 экземпляраў. Цана 6 руб.

Абедзве кнігі выданы Дзяржаўным выдавецтвам пры СНК БССР і паступілі ў продаж.

За высокі ўраджай канюшыны

Чырвоная канюшына — асноўная палявая кармавая культура ў БССР. Гэта стрыжань увадзімых многапольных севазвароту.

Але канюшына не толькі важнейшая кармавая культура. Яе значэнне шматбаковае. Мы яшчэ пакуль не скарысталі яе ў поўнай меры для патрэб соцыялістычнага земляробства.

Як крыніца кармоў, канюшына незраўнаная. Яна дазейнічае быстраму развіццю прадуктыўнай жывёлагадоўлі ўсіх відаў. Не менш важна другая роля канюшыны — як матуснага рычага павышэння ўраджайнасці. Вядома, што канюшына значна ўзбагачвае глебу азотам пры дапамозе клубяньковых бактэрый. Яе карнявая сістэма пранізвае глебу густой сеткай сваіх адгалінаванняў. Гэтая сетка, перагніваючы, паляпшае фізічныя ўласцівасці і структуру глебы. Структураўтваральная роля канюшыны яшчэ больш узрасце, калі сеяць яе з цімафееўкай. Канюшына — лепшы папярэднік усіх каштоўных культур — ільну, пшаніцы, кораніплодаў, бульбы і інш., яна павышае іх ураджайнасць на 30—50 процантаў і больш.

Ролю канюшыны, як сапраўднага сродку павышэння ўраджаяў на ўсіх палях севазвароту, нельга пераацаніць. Мы павінны змагацца не проста за канюшыну, а за канюшыну з высокімі, з года ў год устойлівымі ўраджаямі.

Становішча канюшынасеяння ў БССР далёка незадавальняючае. Мы маем тут такія значныя недахопы, як нізкія ўраджаі сена і насення, атрымліваемыя ў многіх калгасах, выпадкі сістэматычнай гібелі канюшыны часам на значнай плошчы і недахват свайго мясцовага насення для пасеву на адведзімых у севазвароте палях.

Якія-ж меры патрэбны для таго, каб гэтыя дэфекты былі спішчаны і каб яны не паўтараліся ў далейшым?

Мы ставім мэтай атрымане на ўсіх калгасна-соўгасных палях высокіх ураджаяў канюшыны не менш 40—50 цэнтнераў сена з гектара. Ці рэальна такая задача? Вопыт перадавікоў соцыялістычнага земляробства гаворыць, што гэтыя ўраджаі для канюшыны не толькі рэальны, але могуць быць перавышаны.

Вось некалькі прыкладаў.

У 1938 годзе калгас імені Леніна, Смалявіцкага раёна, атрымаў з 37 гектараў па 75 цэнтнераў сена канюшыны. Калгас «Ударнік», Лагойскага раёна, атрымаў з 32 гектараў па 70,4 цэнтнера сена канюшыны. Калгас «14-годзе Кастрычніцкай рэвалюцыі», Барысаўскага раёна, з 3,4 гектара—па 90 цэнтнераў.

У 1939 годзе калгас «Усход», Асіпавіцкага раёна, з 28 гектараў атрымаў па 70 цэнтнераў сена канюшыны.

Гэта не рэкордныя ўраджаі, а ўраджаі, атрыманыя пры сярэднім угнаенні і пры агратэхніцы, даступнай для кожнага калгаса.

Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка паказвае, што ва ўмовах БССР зусім дасягальны і высокія ўраджаі насення канюшыны. Так, у 1938 г. калгас «Чырвоная Дуброўна» (Старадарожскага раёна), калгас «Большэвік» (Чэрвеньскага раёна), калгас імені Дзержынскага (Асіпавіцкага раёна) атрымалі ў сярэднім па 3,5 цэнтнера насення канюшыны з гектара.

Паўстае пытанне — чаму-ж у большасці раёнаў Беларусі канюшына дае нізкія ўраджаі сена і насення? Тут адказ можа быць толькі адзін. Прычына гэтых незадавальняючых ураджаяў — у нізкай агратэхніцы вырошчвання канюшыны.

Якую канюшыну — аднаукосную або двухукосную трэба разводзіць ва ўмовах Беларусі? Даныя Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі і Дзяржсортсеткі гаворыць аб магчымасці паспяховага вырошчвання і адна-і двухукоснай канюшыны ва ўсіх раёнах.

Заслугоўвае асобай увагі той факт, што ў пераважнай большасці пунктаў сортавыпрабавання прывазная канюшына, у тым ліку вядомыя пермскія аднаўкосныя і чарнігаўскія — двухукосныя сарты, не паказала якіх-небудзь пераваг перад мясцовымі сартамі ні па зімастойкасці, ні па ўраджайнасці. На першым месцы — беларуская канюшына. Сярод раду вызначыўшыхся за гэтыя гады сартоў мясцовай канюшыны можна назваць аднаўкосную з калгаса «Чырвоная зорка», Гродзкага раёна, і двухукосную — з калгаса імені Сталіна, Слуцкага раёна.

Прыведзеныя даныя абгрунтоўваюць такія вывады.

У розных раёнах БССР могуць быць дапушчаны на роўных умовах пасевы і аднаўкоснай і двухукоснай канюшыны ў залежнасці ад паяўнасці насення мясцовых праверэных сартоў.

Сяўба канюшыны ў рэспубліцы павінна будавацца на аснове мясцовых старадаўніх сартоў канюшыны.

Выбар лепшых зімастойкіх ураджайных сартоў будзе не аднолькавым для ўсёй рэспублікі. Лепшыя сарты павінны быць раёніраваны ў залежнасці ад прыродных умоў. Адсюль — неабходнасць прадаўжэння работ па сортавыпрабаванню мясцовай канюшыны.

Барацьба за канюшыну павінна праводзіцца на аснове такога агракомплекса, у якім вялікая ўвага ўдзелена падбору зімастойкіх ураджайных сартоў і агратэхнічных прыёмаў, павышаючых зімастойкасць і ўраджайнасць.

Перш чым гаварыць аб асноўных прыёмах агратэхнікі, трэба адказаць на пытанне — якія-ж прычыны гібелі канюшыны ў некаторых месцах? У даны момант няма дакладных матэрыялаў для аналіза гэтай з'явы, не гледзячы на іх выключную важнасць.

Магчыма, што выпадкі гібелі канюшыны тлумачацца вельмі простымі прычынамі, накшталт нарушэння агратэхнікі. Але нельга загадзя спрашчаць становішча. Гэта тым больш абавязкова, што выпадкі значнага выпадзення канюшыны назіраюцца не толькі ў адной Беларусі. Аб іх паведамляюць з старых раёнаў канюшынасеяння — Яраслаўскай, Пермскай і іншых абласцей, дзе вырошчваюцца выключна зімастойкія сарты. Падобныя выпадкі не рэдкасць і за рубяжом. Узнікае меркаванне — ці няма тут агульнай прычыны ў выглядзе фітахвароб, зніжаючых зімастойкасць канюшыны. Гэту думку нельга ігнараваць.

У Беларусі вывучэннем хвароб канюшыны і мер барацьбы з імі фактычна ніхто не займаецца. Ці трэба гаварыць аб тым, што такое становішча непрыпустімае і павінна быць у корані зменена.

Агратэхніка, якая ставіць сваёй мэтай павышэнне зімастойкасці і ўраджайнасці канюшыны, павінна стварыць для яе развіцця такую абстаноўку, пры якой яна была-б агароджана ад неспрыяючых метэаралагічных і глебавых умоў. Не будзем паўтараць падрабязных грунтоўна складзеных аграправіл, прынятых Наркамземам для вырошчвання канюшыны, спынімся толькі на асноўных патрабаваннях і на тых правілах агратэхнікі, якія ў нас яшчэ не сталі агульнапрызнанымі.

Канюшына дапускае шырокі выбар глеб, але яна патрабуе ў кожным асобным выпадку дастатковай угноенасці поля. Трэба адкінуць памылковае ўяўленне аб ёй, як непатрабавальнай культуры. На слаба ўгноеных і няўгноеных палях яна, як правіла, і малаўраджайна і быстра зраджваецца. У папаравым полі пры падсеве канюшыны ў азімае, а пры падсеве пад яравое — у прапашным полі павінны быць унесены арганічныя ўгнаенні: гной 20—40 тон на гектар або яго замяніцелі (торфа-гноевыя сумесі, зялёна-тарфяное ўгнаенне), а пад пакроўную культуру (азімае або яравое) апрача таго фосфарна-калійныя ўгнаенні. На падзолістых глебах з моцнакіслай рэакцыяй абавязкова вапнаванне. На моцна падзолістых глебах (без вапнавання) карнявыя клубянькі на карэннях канюшыны часта не ствараюцца. Канюшына пераходзіць на «бесклубяньковы» рост, пры якім яна з азотазбіральнага ператвараецца ў азотаспажыўна, паглынаючы азот, падобна злакам, з глебавага раствору. Прадукцыйнасць і зімастойкасць яе пры гэтым рэзка зніжаецца. Для яе будзе карысная асабліва ў гэтых умовах прывіўка клубяньковых бактэрый.

Канюшына не выносіць празмернай вільгаці глебы. У месцах, дзе «падпіраюць» грунтовыя воды, дзе застойная вільгаць доўгі час затрымліваецца восенню або вясной, — канюшына «вымакае». Лішнюю ваду на такіх участках неабходна адвесці пры дапамозе канаў або дрэнажа.

На палях з адкрытым ландшафтам, на буграх, дзе снежны пакроў здуваецца і канюшына перапіць ад вымярзання, неабходна штучнае снегазатрыманне.

Алмоўна ўплывае на зімаванне канюшыны паша жывёлы на яе пасевах. Аграправіламі яна забаронена, аднак, усім вядома, як шырока яна ў нас прымяняецца. Замест пашы ў выпадках «перарастання» канюшыны павінна прымяняцца лёгкае падкашванне яе не пазней, як за 20 дзён да асення пахаладання.

Як новы прыём, уводзяцца радковыя машынныя пасевы канюшыны. Скарачаючы расход насення, яны больш верна забяспечваюць усходы. Насенне канюшыны задзелваецца мелка, не глыбей 1,5 см. Добрыя пасевы даюць сеялкі з еўрапейскім сашнікам і ў прыватнасці ільняныя сеялкі. Але пры падсеве канюшыны да яравой культуры пры дапамозе сеялак з дысковымі або руска-амерыканскімі сашнікамі (з вострымі зарываючымися ў глебу насамі) на свежа-ўзрыхленым полі лёгка заглыбіць задзелку насення і пагубіць увесь пасеў. Пасеў траў дапускаецца толькі пры абсталяванні гэтых сеялак «абмежавальнікамі». Для падсеву пад азімыя прыгодны дыскавыя сеялкі, якія на ўшчыльненай глебе могуць працаваць без абмежавальнікаў, пры скарыстанні рэгулятараў глыбіні пасеву.

Не трэба забываць і пра звычайныя прыёмы догляду за канюшынай — праполку ад пустазелля, баранаванне, пад корму суперфасфатам, калійнымі ўгнаеннямі, попелам, гіпсам, фосфагіпсам.

Агратэхніка, павышаючая зімастойкасць і ўраджайнасць канюшыны, патрабуе, каб увесь яе комплекс быў ажыццёўлен поўнасцю.

Цэнтральнай задачай у развіцці канюшынасеяння астаецца арганізацыя насенневодства. Патрэбы рэспублікі ў насенні канюшыны павінны поўнасцю пакрывацца насеннем мясцовых старадаўніх праверэных сартоў. Ва ўсіх калгасах і соўгасах, дзе ёсць каштоўныя мясцовыя сарты канюшыны, максімум пасеваў павінен быць пакінут для збору насення. Недабор канюшыннага сена можна папоўніць за лік пасеву аднагадовых кармавых культур, тады як недахоп канюшыннага насення нельга кампенсіраваць.

Перадавыя калгасы, прадстаўленыя на Выстаўцы, паказалі, што высокія ўраджаі канюшыннага сена зусім сумяшчальны з высокімі ўраджаямі насення. Вопыт перадавікоў, іх агратэхніку, якая забяспечвае высокі збор насення, трэба зрабіць здабыткам усіх калгасаў і соўгасаў БССР. Неабходна рашуча змагацца з няправільнай практыкай многіх калгасаў, якія скарыстоўваюць першы ўкос на сена, часта спазняюцца з ім, а на збор насення глядзяць, як на неабавязковую справу.

Для насеннай канюшыны вельмі карысна ўгнаенне борам. У часе цвіцення канюшынных насеннікаў пчаліныя вуллі трэба перанесці на поле.

Як правіла, насенне аднаўкоснай канюшыны павінна збірацца ў першы год карыстання з падстрыжаных пасеваў. (Падстрыжка — падкашванне—праводзіцца ў часе спеблявання канюшыны на вышыні 15—20 см). Насенне двухукоснай канюшыны збіраецца з другога ўкосу, пры раннім падкашванні першага ўкосу, у часе бутанізацыі — пачатку цвіцення. У сувязі з вострым недахопам насення канюшыны, сёлета канюшыну другога года ва ўсіх магчымых выпадках трэба скарыстаць на насенне. Вялікую ўвагу неабходна ўдзяліць своечасовай уборцы насеннікаў канюшыны, своечасоваму іх абмалоту і чыстаму выціранню пыжыны.

Акадэмік Е. К. АЛЯКСЕЕЎ.

З а р у б я ж о м

Вайна ў Еўропе і Афрыцы

(Дзённік ваенных дзеянняў)

Трэці дзень ваенных дзеянняў на балканскім фронце азнаменаваўся жорсткімі баямі.

Лондамаўскі агляльнік агенцтва Рэйтэр Фергюсон у сувязі з адступленнем югаслаўскай арміі ў паўднёвай Сербіі падкрэслівае, што югаслаўская армія, недастаткова ўзброеная процітанкавымі гарматамі і пазбаўленая эфектыўнага прыкрывання авіяцыі, вымушана была некалькі адступіць. Аднак югаславы б'юцца стойка і храбра, таму яшчэ занадта рана перабольшваць значэнне германскага поспеху.

Італьянскія войскі, аперыруючыя на поўначы Югаславіі, занялі, як гаворыцца ў зводцы італьянскага камандавання, населены пункт Кранішка Гора ў далінах ракі Сава. Італьянская авіяцыя падвергла бамбардыроўцы югаслаўскі порт Шыбенік і авіяцыйныя базы ў Дывуне і Вальцы.

Югаслаўскія войскі вядуць паспяховае наступленне на італьянскія пазіцыі ў Албаніі. Як перадае амерыканская радыёвяшчальная кампанія «Калумбія», югаславы, заняўшыя ў Паўночнай Албаніі горад Скутары, захапілі таксама горад Леш, размешчаны ў 25 мілях на поўдзень ад Скутары. Другая калона югаслаўскіх войск, наступаючая з горада Прызрэна, перайшла паўночна-ўсходнюю граніцу Албаніі.

Бернскі карэспандэнт газеты «Нью-Йорк таймс» піша, што югаслаўскія войскі пераадолеваюць прасоўванцы са Скутары на ўсход уздоўж ракі Дрын. Югаслаўскія часці прасунуліся таксама са Струга і Дэбар, каля возера Ахрыд.

Англійскія самалёты, як перадае штаб англійскіх ваенна-паветраных сіл у Грэцыі, зрабілі налёты на транспарты і танкавыя калоны германскіх войск у раёне Струмицы, у Паўднёвай Югаславіі.

На албанскім фронце грэчаскія войскі паспяхова прадаўжаюць сваё наступленне, пачатае 7 красавіка. Італьянцы, як паведамляе агенцтва Рэйтэр, несучы страты як людзьмі, так і матэрыяламі, адступаюць.

На англа-германскім фронце — значная актыўнасць германскіх узброеных сіл. Вялікія злучэнні германскай авіяцыі, паведамляецца ў зводцы германскага камандавання, атакавалі англійскія суднаі і важныя ў ваенных адносінах аб'екты. У ноч на 9 красавіка некалькі сот германскіх самалётаў паслядоўнымі хвалямі атакавалі рад партовых і прамысловых збудаванняў у Паўднёвай і Цэнтральнай Англіі. Галоўнымі аб'ектамі налётаў былі прадпрыемствы авіяцыйнай прамысловасці ў ваколіцах Ковентры, на якія былі скінуты тысячы фугасных і запальваючых бомб.

У тую-ж ноч вялікае злучэнне англійскіх бамбардыроўшчыкаў, перадае агенцтва Рэйтэр, зрабіла налёт на паўночнае ўзбярэжжа Германіі. Галоўны ўдар англійскай авіяцыі быў накіраваны на германскую ваенна-марскую базу ў Кіле.

***

Германа-італьянскія войскі, якія аперуюць у Паўночнай Афрыцы, дасягнулі 7 красавіка, згодна германскай зводкі, Дэрны, аднаго са значных партаў Кірэнаікі, размешчанага на ўсход ад Бенгазі. Пасля заняцця Дэрны, гаворыцца ў італьянскай зводцы, італа-германскія сілы прадаўжаюць праследаваць англічан. Атрады германскага авіяцыйнага корпуса бамбардыравалі і абстралялі з кулямётаў скапленні англійскіх войск і матарызаваныя калоны.

Англійская і аўстралійская авіяцыя, паведамляецца ў камюніке камандавання англійскіх паветраных сіл на Бліжнім Усходзе, прыкрывае канцэнтрацыю войск англічан на новых пазіцыях, падвяргаючы таксама пастаянным атакам камунікацыі германа-італьянскіх сіл. Англійскія самалёты зрабілі налёты на аэрадромы ў Бенгазі, падвергнуўшы таксама бамбардыроўцы аўтатранспарт і скапленні італа-германскіх часцей.

Ва Усходняй Афрыцы, згодна зводкі італьянскага камандавання, англійскія войскі прадпрынялі моцныя атакі ў сектары Масауа. Паводле англійскіх даных, порт Масауа занят англійскімі часцямі. Масауа з'яўляецца галоўным портам італьянцаў на ўзбярэжжы Краснага мора. Ён быў занят італьянцамі ў 1885 годзе. Да 1900 года горад Масауа з'яўляўся сталіцай Эрытрэі. Насельніцтва горада—звыш 17.000 чалавек. У 1935 годзе порт Масауа быў галоўнай базай італьянскага наступлення на Абісінію.

На астатніх участках фронта Усходняй Афрыкі адзначаецца дзейнасць авіяцыі.

9 красавіка. (ТАСС).

ІТАЛЬЯНСКІЯ СТРАТЫ

ЛОНДАН, 8 красавіка. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, італьянцы страцілі ў Афрыцы 190 тысяч чалавек палонных. Агульныя страты італьянцаў на албанскім фронце складаюць 92 тыс. чалавек. У тым ліку 20 тыс. палонных, 20 тыс. забітымі і 52 тыс. раненымі. Англійскія страты з часу пачатку ваенных дзеянняў у Афрыцы да 23 лютага вызначаліся ў 604 забітымі і 2.362 чалавекі раненымі.

Выступленне па радыё адмірала Лэнда

НЬЮ-ЙОРК, 9 красавіка. (ТАСС). Паводле паведамлення вашынгтонскага карэспандэнта агенцтва Юнайтэд Прэс, старшыня ўрадавай марской камісіі адмірал у адстаўцы Лэнд у прамове па радыё заклікаў ЗША аказаць дапамогу Англіі шляхам барацьбы з падводнымі лодкамі, замест таго, каб снабжаць Англію суднамі, якія будуць патоплены германскімі падводнымі лодкамі. Па словах карэспандэнта, Лэнд, відаць, з'яўляецца тэлефонікам канвеіравання амерыканскімі ваеннымі караблямі гандлёвых суднаў або перадачы Англіі большай колькасці эсмінцаў.

Далей Лэнд заявіў, што амерыканскія верфі атрымалі заказы на будаўніцтва каля 950 гандлёвых суднаў, 913 ваенных караблёў і каля 1.000 невялікіх ваенна-марскіх суднаў. Па словах Лэнда, суднабудаўнічая прамысловасць ЗША, працуючы з поўнай нагрузкай, зможа штогод выпускаць судны агульным водазмяшчэннем ад 3.5 да 4 мільёнаў тон у год. Аднак, заявіў Лэнд, гэтай колькасці, магчыма, будзе недастаткова для пакрыцця ўсіх англійскіх страт.

Стварэнне ўпраўлення мотамеханізаванымі часцямі арміі ў Японіі

ТОКІО, 9 красавіка. (ТАСС). Сёння апублікаван імператарскі указ аб стварэнні пры ваенным міністэрстве ўпраўлення мотамеханізаванымі часцямі арміі. Ва указе гаворыцца, што гэтае ўпраўленне будзе займацца усімі пытаннямі тэхнічнага аснашчэння мотамеханізаваных і кавалерыйскіх корпусаў японскай арміі. У веданні ўпраўлення будуць знаходзіцца ваенныя школы мотамеханізаваных часцей. Адначасова з вырашэннем праблем механізацыі арміі ўпраўленне будзе займацца пытаннямі снабжэння арміі гарючым і інш. У сувязі з гэтым ажыццяўляецца некаторая рэарганізацыя ваеннага міністэрства. Аддзел узбраенняў ваеннага міністэрства ў сувязі з стварэннем пры ім двух секцый—секцыі зброі і секцыі матэрыялаў — будзе падзелен на два аддзелы: механізацыі і агнестрэльнай зброі.

Водгукі замежнага друку на заключэнне дагавора аб дружбе і ненападзе паміж СССР і Югаславіяй

СТАКГОЛЬМ, 8 красавіка. (ТАСС). Учора ўсе вячэрнія газеты змясцілі паведамленне, якое перадае змест перадавых артыкулаў газет «Правда» і «Известия», прысвечаных заключэнню савецка-югаслаўскага дагавора аб ненападзе і дружбе. Газета «Ню даг» адзначае, што заключэнне дагавора з'яўляецца новай бліскучай дэманстрацыяй мірнай палітыкі Савецкага Саюза. Газета «Нюа даглігт алеханда» змясціла паведамленне аб дагаворы пад загалоўкам: «Руска-югаслаўскі дагавор — гачотны дакумент».

ЛОНДАН, 8 красавіка. (ТАСС). Англійскія газеты апублікавалі на першых старонках тэкст дагавора аб дружбе і ненападзе паміж СССР і Югаславіяй, а таксама выказванні савецкага друку ў сувязі з заключэннем дагавора. Тэкст дагавора перадаваўся таксама англійскімі радыёстанцыямі.

БУДАПЕШТ, 8 красавіка. (ТАСС). Венгерскі друк апублікаваў тэкст дагавора аб дружбе і ненападзе паміж СССР і Югаславіяй. Газета «Сузат» дае загаловак: «Советы з павагай адносяцца да цэласнасці югаслаўскай тэрыторыі».

СТАМБУЛ, 8 красавіка. (ТАСС). Перадаючы змест перадавога артыкула «Правды», прысвечанага заключэнню дагавора аб ненападзе і дружбе паміж СССР і Югаславіяй, газета «Тан» адзначае, што гэты важны дакумент заслугоўвае асаблівай увагі і мае вялікае значэнне.

БРАТЫСЛАВА, 8 красавіка. (ТАСС). Усе газеты апублікавалі паведамленне аб падпісанні дагавора аб ненападзе і дружбе паміж СССР і Югаславіяй.

ЧУНЦЫН, 8 красавіка. (ТАСС). Газеты апублікавалі на відным месцы тэкст дагавора аб дружбе і ненападзе паміж СССР і Югаславіяй. Газета «Дагунбао» адзначае ў сувязі з заключэннем гэтага дагавора, што палітыка СССР ставіць сваёй мэтай пазбаўленне чалавецтва ад бед войн.

КАПЕНГАГЕН, 8 красавіка. (ТАСС). Газеты «Політыкен», «Нацыянаў тыдэндэ», «Федрэландэт» і іншыя апублікавалі артыкулы і рэдакцыйныя заметкі, прысвечаныя дагавору аб дружбе і ненападзе паміж СССР і Югаславіяй.

ВАЙНА НА БАЛКАНАХ І Ў АФРЫЦЫ

(Агляд ваенных дзеянняў з 1 па 8 красавіка)

Пачатак красавіка азнаменаваўся адкрыццём трох новых фронтаў: германа-югаслаўскага, германа-грэчаскага і італа-югаслаўскага. У арбіту другой імперыялістычнай вайны ўцягнута Югаславія, якая з'яўляецца найбольш вялікай дзяржавай на Балканскім поўвостраве. Тэрыторыя Югаславіі роўна 247.542 квадратным кілометрам, колькасць насельніцтва—15.700 тыс. чалавек. Даўжыня яе сухапутных граніц складае 2.280 кілометраў, марскіх—больш 700 кілометраў. Югаславія з'яўляецца горнай краінай, больш трох пятых яе тэрыторыі пакрыта горамі. Найбольш вялікія горныя хрыбты знаходзяцца ў паўночна-заходняй і паўднёва-ўсходняй частках краіны і цягнуцца ўздоўж яе дзяржаўных граніц. Італа-югаслаўская граніца праходзіць па паўднёвых адгор'ях Юлійскіх альп, найвышэйшым пунктам якіх з'яўляецца гара Трыглаў (2.863 метры). Непасрэдна да іх прылягае горны хрыбет Караванкен, які да ракі Драва складае граніцу Югаславіі з Германіяй. Югаслававенгерская граніца і, часткова, югаслава-румынская, да ракі Дуная, праходзіць па адкрытай мясцовасці. Аднак наяўнасць вялікіх водных перашкод (р. Дунай і р. Сава), якія цякуць амаль паралельна граніцы, у значнай ступені садзейнічае яе абароне. Паўднёвыя адгор'і Балканскага хрыбта аддзяляюць Югаславію ад Балгарыі. Асобныя іх вяршыні дасягаюць вышыні ў 2300 метраў. Нешматлікія горныя праходы могуць быць лёгка закрыты як з аднаго, так і з другога боку граніцы. Паўднёвыя граніцы Югаславіі таксама выгадны для абароны, бо праходзяць пераважна па горных хрыбтах. Ваенныя дзеянні могуць развівацца ў асноўным па далінах рэк, аднак многія з іх вельмі вузкія і звілістыя. Дарогі часта праходзяць праз тунелі, разбурэнне якіх зробіць немагчымым прасоўванне войск. Югаслаўская армія з'яўляецца самай шматлікай і перадавой з армій краін Балканскага поўвострава. У мірны час яна складалася з 16 пяхотных і 3 кавалерыйскіх дывізій, складаўшых шэсць армій. Карпусоў у югаслаўскай арміі няма. У баявой падрыхтоўцы арміі вялікая ўвага ўдзялялася дзеянням у горах. У ваенны час югаслаўская армія можа быць давезена, па даных замежнага друку, да 2 млн. чалавек. Па тых-жа даных, Югаславія мае прыкладна 1000 самалётаў, з якіх большасць з'яўляецца замежнымі.

Балгара-грэчаская граніца, на якой таксама пачаліся ваенныя дзеянні германскіх узброеных сіл, праходзіць амаль на ўсім працяжэнні па паўднёвых адгор'ях Радопскага горнага масіва. Горныя вяршыны дасягаюць тут вышыні ў 2 тыс. метраў. Адзінымі добрымі праходамі праз іх з'яўляюцца даліны рэк Струмы, Месты і Марыцы (апошняя, як вядома, плыве па граніцы паміж Грэцыяй і Турцыяй). Пачынаючы з 1939 г., грэчаскае камандаванне праводзіла інтэнсіўнае абароннае будаўніцтва на сваёй паўночнай граніцы, асабліва ў далінах указаных рэк. Гэтыя ўмацаванні атрымалі назву «Лініі Метаксаса». Высокая тактычная падрыхтоўка грэчаскіх войск і дастатковае аснашчэнне іх англійскім узбраеннем, у першую чаргу процітанкавай і зенітнай артылерыяй, дазваляюць ім арганізаваць упорную абарону сваёй паўночнай граніцы.

У Абісініі пасля ўзяцця англійскімі войскамі Адыс-Абебы ваенныя дзеянні набліжаюцца к канцу. Тое-ж самае можна сказаць і аб Эрытрэі. Злача Масауа—апошняга апорнага пункта італьянцаў—немінуча. Пераломнымі момантамі ў ходзе ваенных дзеянняў з'явіліся падзенне Керэна ў Эрытрэі і Дырэдауа—у Абісініі. Англійскае камандаванне, перажынуўшы значныя сілы з Лівіі і стварыўшы перавагу ўсіх родаў войск, зламала італьянскае супраціўленне. Важную ролю ў гэтым адыграла англійская авіяцыя, якая на працягу чатырох дзён бесперапынна бамбардыравала ўмацаванні вакол Керэна. Італьянскія часці пасля двухмесячнай упорнай абароны былі, відаць, вельмі змораны і аслаблены, і іх далейшае адступленне адбывалася амаль без усякага супраціўлення. Яны абмежаваліся толькі разбурэннем дарог і мастоў, што, аднак, не змагло затрымаць англійскага наступлення. Асмара і Адыс-Абеба былі зданы без бою.

***

Германа-італьянскае камандаванне паспела за апошні час перакінуць у Трыпалітанію вялікія мотамеханізаваныя сілы. Пасля лосьць доўгай разведчай дзейнасці германскія і італьянскія матарызаваныя і бронетанкавыя часці перайшлі ў наступленне і 4 красавіка занялі Бенгазі, галоўны горад Кірэнаікі, які знаходзіўся на працягу двух месяцаў у руках англічан. Англійскае камандаванне, паслабіўшы гэты фронт за кошт перакідак у Эрытрэю і Грэцыю, вымушана было здаць Бенгазі без бою. У сувязі з прадстаячым завяршэннем ваенных дзеянняў у Абісініі і Эрытрэі англічане змогуць зноў перакінуць свае войскі ў Кірэнаіку і прыпыніць германа-італьянскае наступленне. Выкананне гэтага манёўра можа забяспечыць англійскі ваенна-марскі флот, які паранейшаму пануе ва ўсходняй частцы Міжземнага мора.

Маёр Е. СОСН'Н.

ВЫСТАЎКА АБ БАГДАНУ ХМЯЛЬНІЦКІМ

Беларускі Дзяржаўны гістарычны музей прыступіў да падрыхтоўкі выстаўкі аб гераічнай барацьбе украінскага народа на чале з Багданам Хмяльніцкім у XVII ст. супроць свайго ворага — шляхецкай Польшчы. На выстаўцы будуць прадстаўлены партрэт Багдана Хмяльніцкага работы мастака Выходскага, копія з сучаснай гравюры і літаграфія «Хмяльніцкі пасля Збораўскага бою».

У бітве пад Пілявай у верасні 1648 г. украінскі народ пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага і Максіма Крыванося разграміў адборнае шляхецкае войска і прымусіў яго ўцячы. Гэту гістарычную падзею адлюструе літаграфія з карціны мастака Лебедзева «Бегства польскіх паноў».

Вялікую цікавасць будзе прадстаўляць сабою на выстаўцы ўзбраенне часоў XVII ст. Наведвальнік убачыць: шлемы, нагруднікі, кальчугі, гармату, ядры і рад іншых экспанатаў. З халоднай зброі будуць прадстаўлены: бердыш, кап'ё, рагаціна, крэмневыя пісталеты і інш.

Выстаўка будзе знаходзіцца ў файэ кінатэатра «Чырвоная зорка» і з'явіцца своеасаблівым наглядным дапаможнікам да кінофільма «Багдан Хмяльніцкі».

Выпуск трактарыстаў

ВАЛКАВЫСК. (Па тэлефону). У лютым мінулага года ў Валкавыску была створана школа трактарыстаў. За гэты час школа выпусціла больш 300 трактарыстаў. 6 красавіка адбыўся чарговы выпуск. Выпушчана 86 трактарыстаў. Большасць выпускнікоў здала іспыты на выхатна і добра. Усе трактарысты будуць прапаваць у МТС Беластоцкай абласці.

Г. СКУЦЭНЯ.

Рост зберажэнняў працоўных

За апошні час прыкметна павялічыўся прыток укладаў у ашчадныя касы горада Мінска. Многія касы значна перавыканалі план першага квартала па ўкладах. Ашчадная каса № 16/88 выканала план на 191,7 проц., ашчадная каса № 16/08 — на 160,1 проц. і т. д. Сума тэрміновых укладаў за квартал павялічылася на 1.595 тысяч рублёў.

Сярэдні размер уклада па гораду Мінску складзе 3.564 рублі. (БЕЛТА).

Новая электрастанцыя

НОВАГРУДАК, 9 красавіка. (БЕЛТА). На шклозаводзе «Нёман» уступіла ў строй новая электрастанцыя, якая дае заводу вялікую эканомію паліва. Пуск яе забяспечыў электраасвятленнем таксама рабочы пасёлак і падсобную гаспадарку завода.

Па старонках газет

400 тысяч рублёў адпушчана на радыёфікацыю раённых цэнтраў і калгасных вёсак Гомельскай абласці. У Веткаўскім раёне поўнасцю радыёфікуецца Хальчанскі сельсавет, у Добрушскім — калгасы Крупецкага і Жгунскага сельсветаў. Поўнасцю радыёфікуецца вёска Затон, Стрэшынскага раёна.

(«Гомельская праўда»).

95 калгасных гаспадарак Лепельскага раёна выехала на пастаяннае жыхарства ў Омскую абласць.

(«Калгасная праўда»).

Закончана пераатэстацыя трактарыстаў Дрысенскай МТС. 54 трактарысты атрымалі званне трактарыстаў першай катэгорыі, 31 — другой катэгорыі.

(«Патрыёт радзімы»).

Падсочка клёна і бярозы. У гэтым годзе ў Асіпавішкім раёне будзе зроблена падсочка 3.000 дрэў клёна і бярозы. Будуецца вопытная ўстаноўка для вырабу з соку сіропа.

(«Калгасная праца»).

Усеармейскія стралкова-стэндавыя спаборніцтвы

З 12 па 15 красавіка ў Маскве адбудуцца ўсеармейскія стралкова-стэндавыя спаборніцтвы. У іх прыме ўдзел звыш 100 майстроў стэндавай стрэльбы Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Ваенна-паляўнічае таварыства Заходняй Асобай Ваеннай Акругі выставіла для ўдзелу ў гэтых спаборніцтвах каманду з 7 лепшых стралкоў. Рыхтуючыся да спаборніцтваў, яны пад кіраўніцтвам майстра спорта СССР тав. Барысенкі ўзмоцнена трэніраваліся.

Каманда ў поўным саставе выехала ў Маскву.

Суд

ЗАГОРТАЧНАЯ ПАПЕРА

Жыццё былога загатчыка магазіна № 61 Мінхарчгандлю М. М. Рабіновіча працякала спакойна. Пасля рабочага дня ён любіў апачываць у сваёй утульнай, добра мэбліраванай кватэры.

Але больш за ўсё любіў Рабіновіч загортачную паперу. Бывала, убачыць, што хто-небудзь марна расходуе яе, абавязкова захвалюецца: «Нельга. Не пагаспадарску».

Любоў Рабіновіча да загортачнай паперы была не выпадковай. Яна яго карміла, паіла. Яна дала яму і ралёўприёмнік, і патэфон, і веласіпед, і...

Але наскочыла рэвізія. Затым пачалося следства. Вынайдзены Рабіновічам метад ператварэння звычайнай загортачнай паперы ў грошы быў выкрыт. Рабіновіч са сваімі памочнікамі Барашковым і Бернштэйнам прадсталі перад судом.

На судзе выявіліся абураючыя факты раскрадання дзяржаўных сродкаў, жульніцкіх аперацый з загортачнай паперай. Рабіновічу было прадастаўлена права закупляць паперу для магазіна. Але замест куплі паперы ён заняўся злачыннымі махінацыямі. Загадчык матэрыяльнай базы Гандальпладагароднага трэста П. А. Барашкоў, памочнік загадчыка пасудна-гаспадарчага магазіна Мінпромгандлю М. Ш. Бернштэйн сістэматычна выдавалі яму фальшывыя рахункі, пацвярджаючыя пакупку паперы. Не задавальваючыся гэтым, Рабіновіч сам страпаў фіктыўныя рахункі ад імені міфічных асоб. Гэтыя фальшывыя рахункі Рабіновіч перадаваў у бухгалтэрыю.

Усе ўтраіх былі задаволены. У кішэні Рабіновіча цяклі тысячы рублёў дзяржаўных сродкаў, Барашкоў атрымліваў 10 процантаў узнагароды ад кожнай выстаўленай у фіктыўным рахунку сумы. У магазіне, якім загадваў Рабіновіч, ён мог атрымаць прадукты ў любой колькасці. Не быў пакрыўджан і Бернштэйн. Усяго Рабіновічам было прысвоена каля 12 тысяч рублёў.

Справа слухалася ў народным судзе 15-га ўчастка г. Мінска. Рабіновіч прыгавораны да 10 год зняволення ў аддаленых мясцовасцях СССР, з пасляедуючым паражэннем у правах на 3 годы. Бернштэйн — на 6 год, Барашкоў — на 5 год пазбаўлення волі ў аддаленых мясцовасцях СССР.

Паведамленні

11 красавіка, у 8 гадзін вечара, у памяшканні інстытута народнай гаспадаркі (актавы зал, Земляробчы зав., 6) адбудзецца даклад аб міжнародным становішчы.

Чытае дацэнт т. Драгілеў.

***

Парткабінет Кагановіцкага РК КП(б)Б перамяшчаецца ў памяшканне Дома тэхнікі (Комсамольская 27).

Парткабінет працуе з 9 гадзін раніцы да 2-х гадзін дня і з 7 да 10 гадзін вечара. Выходны дзень — нядзеля.

Кагановіцкі РК КП(б)Б.

Адказны рэдактар
М. К. АСТАПЕНКА.

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР
10 красавіка
ТРЫЛЬБІ
Пачатак у 8 г. веч.
Бліжэйшая прэмера
КАЗКІ ГОФМАНА

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР
10 красавіка — прэмера
А. Афінагенаў.
МАШАНЬКА
Пачатак у 8 г. веч. Каса адкрыта з 2 г. дня да 8.30 веч.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
10 красавіка
прэмера
ЗАКАЛДАВАНЫ КРАВЕЦ
Пачатак у 8 г. веч.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ФІЛАРМОНІЯ
КАНЦЭРТНАЯ ЗАЛА
(рог вул. Урыцкага і Карла Маркса 21/13)
10 і 11 красавіка
МАСКОЎСКІ АНСАМБЛЬ БАЛЕТНАЙ МІНІЯТУРЫ
У праграме: хорэаграфічны скетч, парадзійна-сатырычныя танцы, акрабатычныя эцюды, эксцэнтрычныя танцы і інш.
Пачатак у 9 гадзін вечара.
Білеты ў касе канцэртнай залы з 12 да 2 г. дня і з 5 да 9 г. веч.
АНОНС! 12 і 13 красавіка канцэрты лаўрэата Усесаюзнага конкурса вакалістаў
Ніны ДОРЛІАК (сапрана).

Кінатэатр «Чырвоная зорка»
МАЙСКАЯ НОЧ
Кінатэатр «РОДИНА»
ДРУЖБА

Дзіцячы кінатэатр
Дзённыя сеансы
ДУМА ПРА КАЗАКА ГАЛОТУ
Вячэрнія сеансы для дарослых
ЯКАЎ СВЕРДЛОЎ
Кінатэатр «Інтэрнацыянал»
СТО МУЖЧЫН І АДНА ДЗЯЎЧЫНА

Кінатэатр «НАВІНЫ ДНЯ»
(б «Спартак»)
1. Горная Шорыя (навукова-папулярны фільм).
2. Прыгуны (кінанарыс).
3. Саюзкінажурнал №№ 27 і 29.
4. Кінажурнал «Наука и техника» № 8.

АКРУГОВЫ ТЭАТР ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ЗАХАВА
ГАСТРОЛІ ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА МУЗЫКАЛЬНАЙ КАМЕДЫІ БССР
12, 13 і 14 красавіка
БАЯДЭРА
Аперэта ў 3 дзеях.
Музыка Э. Кальмана.
Пачатак у 8 г. веч. Каса з 2 г. дня да 9 г. веч.

Беларуская кантора „ГЛАВКИНОПРОКАТ"
выпускае на экраны кінатэатраў рэспублікі
вялікі мастацкі гістарычны фільм
БОГДАН ХМЕЛЬНИЦКИЙ
Гэты фільм прысвечан гераічнай барацьбе у XVII стагоддзі озабодалюбнага украінскага народа з польскімі прыгнятальнікамі.
Ён расказвае аб слаўным прадводзіцелю войска запарожскага гетману, Багдану Хмельніцкім.
Аўтар сцэнарыя—А. КАРНЕЙЧУК
Рэжысёр — І. САЎЧАНКА.
Другі рэжысёр—Б. СВЕШНІКАЎ.
Аператар — Ю. ЕКЕЛЬЧЫК.
Мастак — Я. РЫВОШ.
Кампазітар — С. ПАТОЦКІ.
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:
засл. арт. рэсп. Н. МАРДВІНАЎ,
арт. Г. ЖУКОЎСКАЯ,
арт. Н. ІЛЬЧЭНКА.
арт. Б. БЕЗГІН,
засл. арт. рэсп. М. ЖАРАЎ,
засл. арт. В. ПАЛІЦЭЙМАКА,
засл. арт. рэсп. М. ВЫСОЦКІ,
засл. арт. рэсп. Э. ЦЭСАРСКАЯ,
засл. арт. рэсп. Д. МІЛЮЦЕНКА.
ВЫТВОРЧАСЦЬ КІЕЎСКАЙ КІНОСТУДЫІ.

ДА ЎВАГІ БАЛГАСАЎ, СОЎГАСАЎ, ДОМАЎПРАЎЛЕННЯЎ, ІНТЭРНАТАЎ І ГРАМАДЗЯН.
НА СОВЕЦКАЙ ВУЛ., № 25
АПТЭКАЎПРАЎЛЕННЕМ
АДКРЫТ СПЕЦЫЯЛЬНЫ МАГАЗІН
ДЗЗІНФЕКЦЫЙНЫХ СРОДКАЎ І ДЗЗАПАРАТУРЫ.
У ПРОДАЖУ ЁСЦЬ:
ХЛОРНАЯ ВАПНА,
НАФТАЛІН,
КАРБОЛКА чорная,
НАФТАЛІЗОЛ,
ФАРМАЛІН,
ФЛІЦЫД (сродак ад клапоў),
САЛЬВЕНТАВАЯ ПАСТА,
сродкі для барацьбы з грызунамі,
сродкі супроць насякомых,
сродкі для знішчэння мух,
парашок «Пірэтрум» ад клапоў і тараканаў.
ПРАДАЮЦЦА ДАМАШНІЯ ПУЛЬВЕРЫЗАТАРЫ (для знішчэння насякомых), МУХАЛОЎКІ ШКЛЯНЫЯ, ЛІПКАЯ МАСА, СУХІЯ МУХАМОРЫ, ДЗЗАДЫЯТАРЫ і інш.
МІНАБЛАПТЭКАЎПРАЎЛЕННЕ.

ДА ВЕДАМА ЎСІХ ПАЛЯЎНІЧЫХ!
ВЯСЕННЯЕ ПАЛЯВАННЕ
на ўсёй тэрыторыі БССР, апрача запаведнікаў і заказнікаў,
дазваляецца
на селезняў (самцоў) усіх парод, качак, цецерукоў (самцоў) і вальдшнепаў (слонак)
з 20 красавіка да 5 мая 1941 года.
КАТЭГАРЫЧНА ЗАБАРАНЯЕЦЦА паляванне на ўсе іншыя віды птушак, збіранне яек, разбурэнне гнёздаў, а таксама карыстанне сабакамі пры ўсіх спосабах вясенняга палявання.
За нарушэнне на браканьераў накладаецца ШТРАФ да 300 руб.
ПАЛЯЎНІЧЫЯ! Строга захоўвайце ўстаноўленыя тэрміны палявання. Выяўляйце браканьераў; складзенныя на іх акты пасылайце Дзяржаўнай інспекцыі па паляўнічаму промыслу пры СНК БССР.
ДЗЯРЖАЎНАЯ ІНСПЕКЦЫЯ ПА ПАЛЯЎНІЧАМУ ПРОМЫСЛУ ПРЫ СНК БССР.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Совецкая, 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказны рэдактар — 2-00-00 (камутатар); дадатковы — 102; прыёмная рэдактара — 2-13-52; намеснік адказнага рэдактара — 2-51-88; адказны сакратар—2-13-53; намеснік адказнага сакратара — 2-13-09, сакратарыят — 2-39-55. Аддзелы: загадчык партыйнага аддзела — 2-18-46, літработнікаў — 2-13-56, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-89, загадчык эканамічнага аддзела — 2-08-30, літработнікаў — 2-15-56; літработнікаў па літаратуры і мастацтву, школах, ваенна-фізкультурнай рабоце, унутранай інфармацыі — 2-18-83; аддзел рабселькораў і пісем працоўных — 2-13-60, заг. выдавецтва — 2-13-58; бухгалтарыя выдавецтва і аддзел абмену — 2-08-44, выпускаючы — 2-47-68; карэктарская — 2-13-57.

У1914. Друкарня газеты «Звязда». М., М., Ш.